Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
№166 (28530)
30 ЖНІЎНЯ 2017 г. СЕРАДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
стар. 5–12



**Распраўляемся з адходамі эфектыўна** МС



**З «шагалаўскім» ухілам** МС



**Як распазнаць інфаркт?** СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Мікалай ШАРСТНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

*«Падрыхтоўка рабочых кадраў павінна весціся ў цесным супрацоўніцтве ўстаноў прафтэхадукацыі і вытворчасці. Прадпрыемствам неабходна забяспечыць практыку, тады на выхадзе атрымаем высакакласнага спецыяліста. Больш глыбока павінна быць прапрацавана пытанне мэтавага навучання. Вучні, якія атрымліваюць прафтэхадукацыю, павінны ўмець працаваць на сучаснай тэхніцы, таму ўжо сёлета трэба забяспечыць праходжанне практыкі ў найлепшых гаспадарках і прадпрыемствах. У навучэнцаў павінна быць магчымасць працаваць на найноўшай тэхніцы, бачыць у будучай прафесіі станоўчыя бакі, атрымліваць перадавы вопыт».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9236 | ▼ |
| Еўра | 2,3143 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0755 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# РАНЕЦ — КОЖНАМУ

**Незалежна ад колькасці грошай у кішэні, ад таго, як склаліся жыццёвыя абставіны, кожны маленькі жыхар Беларусі, які збіраецца ў школу, варты падарунка да 1 верасня. Менавіта таму ўжо традыцыяй сталі акцыі грамадскіх аб'яднанняў нашай краіны, якія дапамагаюць сабраць заплечнік першакласнікам, сіротам, шматдзетным, маламаёмным і прыёмным сем'ям, а таксама тым, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў.**

**Прафсаюзы не толькі рыхтуюць поўныя канцтавараў дзіцячыя ранцы, але і робяць для школьнікаў святы. Так, напрыклад, паступіла такое аб'яднанне прадпрыемства «БЕЛАЗ», што зладзіла для бацькоў і іх дзяцей тэатралізаванае прадстаўленне і конкурсы. У цэлым матэрыяльную дапамогу ад прафесійных аб'яднанняў краіны атрымліваюць падшэфныя дзіцячыя сацыяльныя прытулкі, школы-інтэрнаты, дамы сямейнага тыпу.**

**«Белая Русь» у гэтым годзе не толькі падорыць неабходныя для заняткаў тавары, але і нагадае школьнікам пра тое, што варта паводзіць сябе асцярожна з агнём і на дарозе, уручыць яшчэ і флікеры. Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі зладзіў акцыю «У школу з добрым сэрцам» ва ўсіх рэгіёнах краіны, а члены Беларускага саюза жанчын наведаюць з падарункамі Ждановіцкую школу-інтэрнат для дзяцей з парушэннем слыху.**




Фота БЕЛТА.

■ Напярэдадні

## З ладдзі — на паветраны шар

### Чым Полацк рыхтуецца здзіўляць гасцей Дня беларускага пісьменства?

**Запрошана больш як паўтысячы гасцей і больш за сотню журналістаў рэспубліканскіх СМІ. Праграма ўключае каля васьмі дзясяткаў імпрэз. Спецыяльнае меню ў рэстаранах і кавярнях, загадзя забраніраваныя літаральна ўсе гасцініцы горада і суседняга Наваполацка, квартал рамеснікаў, якія па ўмовах удзелу павінны прэзентаваць толькі старажытныя промыслы, навуковая канферэнцыя, мноства літаратурных імпрэз. Так, Дзень беларускага пісьменства, што пройдзе ўжо на выхадных у Полацку, абавязкова здзівіць яскравымі імпрэзамі і разнастайнасцю праграмы.** СТАР. 4



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Сумесны праект «Звязды» ... ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

## ЗІМА СПЫТАЕ

### Як давесці да ладу ацяпляльнае абсталяванне?

**Летняя цеплыня зусім хутка возьме доўгайграючую паўзу. На падыходзе верасень, а гэта значыць, што слупок тэрмометра па начах будзе апускацца ўсё бліжэй да нуля. Зноў давядзецца «расчахляць» печкі, каб не мерзнуць ад холаду. Таму канец лета і пачатак восені — найлепшы час для таго, каб прывесці ацяпляльнае абсталяванне ў поўную баявую гатоўнасць. Аб тым, як гэта правільна зрабіць, «Звяздзе» расказаў афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі Віталь НАВІЦКІ.**

Першыя ўзгаранні з-за выкарыстання ацяпляльнага абсталявання фіксуюцца ўжо ў верасні. Напрыклад, летась ратавальнікі тушылі пажар у вёсцы Вялікая Слабада Крупскага раёна літаральна ў другі дзень восені. Віноўнікам стаў кацёл, які працаваў на цвёрдым паліве. А 17 верасня ў вёсцы Кляноўка Дзяржынскага раёна загарэлася печка ў лазні на прыватным падворку. «Гарачым» пунктам стаў комін. Літаральна ў гэты ж дзень па такім жа сцэнарыі разгортваліся падзеі яшчэ ў адной вёсцы на Дзяржыншчыне — Бярэжы. На шчасце, у тых пажарах ніхто не загінуў.

— Кватэру ў шматпавярховіку падрыхтаваць да зімы куды лягчэй, чым прыватны дом, дзякуючы наяўнасці цэнтралізаванага ацяплення. Увагу трэба звярнуць на вентыляцыйныя каналы, калі выкарыстоўваецца газавае абсталяванне. Праверце, ці ёсць у іх цяга. Бо раней была вельмі распаўсюджана практыка, калі людзі вырашалі «павялічыць» плошчу кухні, дзяўбалі ў сцяне нішу і ставілі туды халадзільнік. А ў кватэрах ніжэй вентыляцыя пачынала працаваць абы-як. Паглядзіце, ці ў нармальным стане праводка, — чым халадней, тым больш часу мы ўсе праводзім «у чатырох сценах». І падумайце пра тое, як дадаткова абаграваецца ў выпадку рэзкага наступлення халадоў. Электрычны абагравальнік мусіць быць выключна заводскай вытворчасці.

Калі паглядзець у пашпарт любога прыбора, то там згадваюцца два тэрміны — гарантыйны і агульны эксплуатацыйны. Што азначае апошні? Скажам, вытворца разлічыў, што прылада можа эксплуатавацца дзесяць гадоў пасля набыцця. Калі гэты час скончыцца, то вытворца адказваць за наступствы, звязаныя з працай прыбора, ужо не будзе. На жаль, тэндэнцыя апошніх гадоў — скарачэнне заяўленага тэрміну службы. Як правіла, савецкія апараты разлічваліся на 10 гадоў работы. Цяпер жа гэты адрэзак можа складаць і 7, і нават 5 гадоў... СТАР. 14

# УЗОРНАЯ ПРАФЕСІЯ

### Напярэдадні Дня ведаў Прэзідэнт уручыў дзяржаўныя ўзнагароды педагогам

**Відаць, упершыню дзень дзяржаўных узнагарод у Палацы Незалежнасці быў цалкам прысвечаны педагогам. Ад выхавальнікаў дашкольных устаноў, настаўнікаў сярэдніх школ і да выкладчыкаў каледжаў і універсітэтаў — кожны з іх дасягнуў вышынь у сваім майстэрстве і валодае ўнікальным досведам.**

— Наша сустрэча асаблівая, — падкрэсліў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ў вітальным слове. — Яна адрозніваецца ад падобных мерапрыемстваў тым, што сёння ў зал запрошаны найлепшыя работнікі сістэмы адукацыі.

Многія з іх, дарэчы, былі ўдзельнікамі Рэспубліканскага педагагічнага савета.

— Мне прыемна бачыць тут людзей, якія фарміруюць маральную і духоўную аснову маладога пакалення беларусаў, — прызнаўся кіраўнік краіны. — Прывіваючы ім з дзяцінства любоў да сапраўдных каштоўнасцяў, перадаючы свае веды, вы садзейнічаеце станаўленню адукаванай, культурнай і працалюбівай беларускай нацыі.

Кожнае дзіця мае патрэбу ў выхаванні з маленства:

— Таму велізарнае значэнне набывае якасць работы дашкольных устаноў, — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. — Яна ў першую чаргу залежыць ад выхавальнікаў, ад іх душэўнай цеплыні і ўмення падабраць ключык да кожнага малога. Такія людзі заслугоўваюць усялякай падтрымкі і заахвочвання.

Удастоены дзяржаўных узнагарод за свае працоўныя поспехі, высокі прафесіяналізм, вернасць прызванню педагога найлепшыя кіраўнікі і настаўнікі сталічных, абласных і раённых школ і гімназій. Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што ўзнагароды стануць для іх добрым стымулам у далейшай, яшчэ больш паспяховай працы.

— Важную ролю іграе прафесійна-тэхнічная адукацыя, мы пра гэта ўжо казалі, — зазначыў Прэзідэнт. — Мы дасягнулі ў развіцці нашай прафесійна-тэхнічнай адукацыі немалых поспехаў. Запатрабаванасць яе ў краіне і ў замежных партнёраў з'яўляецца своеасаблівым знакам якасці. Узнагародамі былі адзначаны найлепшыя прадстаўнікі ліцэяў і каледжаў з Віцебска, Івацэвічаў, Крычава, Мінска, Магілёва, Пінска.

Што да вышэйшай школы, то, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, многія вышэйшыя навучальныя ўстановы паспяхова ўкараняюць інавацыйныя метады навучання, становяцца сапраўднымі цэнтрамі прасоўвання навукова-тэхнічнага прагрэсу як у рэгіёнах, так і ў сталіцы. Ганаровыя званні і падзякі атрымалі рэктары і старшыні ВНУ. Усе яны, як адзначыў Прэзідэнт, «знаходзяцца на аднолькавай ступені развіцця і падрыхтоўкі будучых спецыялістаў».

Напрыканцы Аляксандр Лукашэнка, які з асаблівай павагай ставіцца да прафесіі настаўніка, да яго ролі ў жыцці грамадства, дзяржавы, пажадаў удзельнікам доўгіх гадоў жыцця, шчасця, дабрабыту і новых дасягненняў у іх нялёгкай, але такой пачэснай працы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# Гісторыя робіцца зараз

### Кіраўнік дзяржавы правёў перагаворы з высокай дэлегацыяй з Судана

**Візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Судан у студзені бягучага года называюць гістарычным. Прычым самі суданцы. Па выніках значна актывізавалася ўзаемадзеянне па лініі міністэрстваў і ведамстваў, а таксама асобных прадпрыемстваў дзвюх краін. Такім чынам, першае паўгоддзе стала этапам для вызначэння, над чым нашым краінам найбольш цікава і карысна працаваць сумесна. Цяпер жа настаў час рэалізацыі задумак.**

З візітам у нашай краіне знаходзіцца дэлегацыя з Судана на чале са старшынёй Нацыянальнай асамблеі гэтай краіны Ібрагімам Ахмедам Амерам. Разам з парламентарыямі да нас прыехалі прадстаўнікі ўрада, а таксама бізнесмены.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: у Беларусі візіт такой прадстаўнічай дэлегацыі разглядаюць як працяг двухбаковага дыялогу, пачатага ў студзені 2017 года.

— Вельмі важна, што дасягнутыя тады дамоўленасці паспяхова выконваюцца, — адзначыў Прэзідэнт. — Я неаднаразова звяртаў увагу кіраўнікоў беларускіх міністэрстваў, рэгіёнаў і прадпрыемстваў на неабходнасць старанннай прапрацоўкі шляхоў актывізацыі ўзаемадзеяння з вашай краінай. Пры гэтым неабходна, каб нашы канструктыўныя палітычныя адносіны адлюстраваліся ў канкрэтных рэзультатах гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Па словах беларускага лідара, у цяперашні час узровень беларуска-суданскага міждзяржаўнага ўзаемадзеяння ўзрос. За апошнія паўгода візіту ў Хартум здзейсніліся беларускія дэлегацыі самага высокага ўзроўню. Яны разгледзелі пытанні супрацоўніцтва ў сферах энергетыкі, нафты і газу, прыродных рэсурсаў, геалогіі, сельскай гаспадаркі, дрэваапрацоўкі, лёгкай прамысловасці, будаўніцтва і міжбанкаўскага супрацоўніцтва.

— Гэта быў этап вызначэння сумесных праектаў і прадметнага абмеркавання шляхоў іх рэалізацыі, які можна лічыць завершаным, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Зараз не марудзячы важна прыступіць да выканання намечаных планаў. Беларусь усур'ёз настроена на паспяховае ўвасабленне сумесных праектаў з Суданам у названых сферах. Мы разлічваем, што ў кіраўніцтва вашай краіны аналагічны падыход, і гэтыя планы займеюць падтрымку суданскіх парламентарыяў.

Наш бок падрыхтаваў для дэлегацыі даволі насычаную праграму, якая ўключае ў сябе сустрэчы з афіцыйнымі асобамі Беларусі, так і наведванне нашых асноўных прамысловых, сельскагаспадарчых, навукова-вытворчых пляцовак.

— Мы спадзяёмся, што падчас знаёмства з Беларуссю вы зможаце ў поўнай меры адчуць эканамічны, прамысловы, навуковы, культурны патэнцыял нашай краіны. Абсалютна ўпэўнены, што ваш цяперашні візіт у Мінск адкрые новыя перспектывы беларуска-суданскага ўзаемадзеяння, — сказаў Прэзідэнт.

Ібрагім Амер падзякаваў беларускаму лідару за цёплы прыём і перадаў прывітанне ад Прэзідэнта Судана.

Падчас сустрэчы ў Палацы Незалежнасці разглядаліся розныя кірункі супрацоўніцтва. Найбольш перспектыўныя і цікавыя для абедзвюх дзяржаў — прамысловая кааперацыя, сельская гаспадарка, адукацыя.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# МОСТ ДРУЖБЫ

### Беларусь і Судан падпісалі мемарандум аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве

**Бакамі, якія заключылі дагавор, выступілі Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Нацыянальная асамблея Рэспублікі Судан. Сам дакумент падпісалі старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА і старшыня Нацыянальнай асамблеі Судана Ібрагім Ахмед АМЕР.**

Старшыня Палаты прадстаўнікоў выказаў надзею, што візіт старшыні Нацыянальнай асамблеі Судана Ібрагіма Ахмеда Амера паспрыяе найхутчэйшаму падпісанню дарожнай карты і пачатку рэалізацыі канкрэтнага супрацоўніцтва. Таксама Уладзімір Андрэйчанка прапанаваў правесці бізнес-форум на тэрыторыі Беларусі або Судана, сустрэцца з дзелавымі коламі, бізнес-супольнасцю і абмеркаваць пытанні, закладзеныя ў дарожнай карце.

— Сёння мы ствараем мост у сферы палітыкі і эканомікі паміж Мінскам і Хартумам, — адзначыў старшыня Нацыянальнай асамблеі Судана Ібрагім Ахмед Амер. — Падпісанне мемарандума з'яўляецца пацвярджэннем жадання дзвюх краін працаваць над развіццём і пашырэннем двухбаковага супрацоўніцтва.

***

Падчас сустрэчы з дэлегацыяй з Судана **Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі**, выказаў меркаванне, што візіт замежных гасцей прынясе прыраў у адносінах паміж нашымі краінамі. Спікер верхняй палаты парламента прапанаваў здзяйсняць трансфер беларускіх тэхналогій і ведаў. Напрыклад, у сферы медыцыны, інжынерных і прыродазнаўчых навук, стварэнні харчавання. Акрамя таго, варта ўмацоўваць дагаворна-прававую базу нашага супрацоўніцтва, а гэта восем сумесных дагавораў, датычных перш за ўсё эканамічнага ўзаемадзеяння. Таксама перспектыўнымі, прыярытэтнымі кірункамі Міхаіл Мясніковіч бачыць навукова-тэхнічнае і адукацыйнае супрацоўніцтва, прамысловасць, вырашэнне пытанняў міжбанкаўскай сферы.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*
**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

## Класныя навіны

# Па новым графіку

**Каля 60% мінскіх школ будуць пачынаць заняткі ў 9.00. Пра гэта паведаміў журналістам старшыня камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Міхаіл МІРОНЧЫК.**

Ён запэўніў, што педагогі гатовы працаваць па абноўленых вучэбных праграмах і новым графіку. «Мы вызначыліся так: тыя школы, якія працуюць у адну змену, будуць пачынаць заняткі ў 9.00, а школы, якія займаюцца ў дзве змены, урокі пачнуць у 8.30». Калі бацькам трэба ехаць на работу раней, гэта таксама не праблема: дзяцей у школах будуць прымаць педагог і дзяжурны адміністратар, таму яны будуць знаходзіцца пад наглядам дарослых.

1 верасня ў сталіцы адкрыецца новабудоўля ў мікрараёне Дамброўка — сярэдняя школа №41 на 1 020 месцаў з басейнам. Ва ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі Мінска прыйдзе амаль на 7 тысяч школьнікаў больш у параўнанні з папярэднім навучальным годам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Знай нашых

# ВЕЛАСІПЕД З МАТОРЧЫКАМ

**Айчынныя электравеласіпеды могуць з'явіцца ў продажы ў наступным годзе. Аб гэтым паведаміў генеральны дырэктар ААТ «Прыборабудаўнічы завод «Аптрон» Нацыянальнай акадэміі навук Мікалай ЯНКЕВІЧ.**

«Веласіпед з мотаколам будзе прадавацца ўжо з вясны. Прычым з'явіцца не толькі двухколавы, але і трохколавы варыянт», — расказаў Мікалай Янкевіч. Акрамя таго, кіраўніцтва завода разлічвае арганізаваць вытворчасць на сваёй базе, але пры гэтым захаваць брэнд «Бусел». Мотавеласіпед здольны развіць скорасць да 40 кіламетраў за гадзіну. Магутнасць матора складае 600 ват, ён працуе ад акумулятара. Калі магутнасць павысіць, то можна будзе перавозіць і грузы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Савет Бяспекі ААН правёў экстраннае пасяджэнне ў сувязі з ракетным выпрабаваннем КНДР



Ініцыятарамі яго склікання сталі Японія, ЗША і Паўднёвая Карэя. Ноччу, 29 жніўня, КНДР запусціла, як мяркуецца, балістычную ракету сярэдняй далёкасці. Снарад праляцеў над тэрыторыяй Японіі і ўпаў за 1180 кіламетраў ад мыса Эрымо вострава Хакайда. У Токіа заявілі, што не сталі збіваць ракету, паколькі тая «не ўяўляла небяспекі». Тым не менш улады паўночных раёнаў краіны папярэдзілі грамадзян аб ракетнай пагрозе, прапанаваўшы прыняць меры засцярогі. Таксама на кароткі час быў спынены рух хуткасных цягнікоў Сінкансэн і электрычак. Гэты пуск стаў другім за апошнія дні.

## Мігранты адправілі з Германіі дадому найбуйнейшую ў гісторыі суму

Працоўныя мігранты, якія знаходзяцца ў Германіі, летась перавялі 4,2 мільярда еўра. Гэта найбуйнейшая сума за ўсю гісторыю краіны з моманту аб'яднання ў 1990 годзе. Пра гэта піша нямецкае выданне WirtschaftsWoche са спасылкай на даныя Бундэсбанка. У параўнанні з 2015 годам агульная сума адпраўленняў вырасла на 700 мільёнаў еўра. Больш за ўсё сродкаў мігранты перавялі ў Турцыю — каля 800 мільёнаў еўра. WirtschaftsWoche адзначае, што дадзеная сума застаецца стабільнай на працягу некалькіх гадоў. Пры гэтым аб'ём пераводаў у Сірыю за 2016 год вырас адразу ў чатыры разы — з 18 да 67 мільёнаў еўра.

## Мексіка не будзе плаціць за будаўніцтва сцяны на мяжы з ЗША

Урад Мексікі не збіраецца фінансаваць будаўніцтва сцяны на мяжы з ЗША, як прапануе амерыканскі прэзідэнт. Адпаведную заяву размясцілі на сайце МЗС краіны. «Такая пазіцыя адпавядае прынцыпу суверэннасці і нацыянальнай годнасці», — гаворыцца ў паведамленні. Днямі Трамп назваў Мексіку краінай з «адным з самых высокіх узроўняў злачыннасці» і зноў нагадаў аб неабходнасці ўзвядзення сцяны. Як вядома, дзяржаўная мяжа паміж Мексікай і ЗША праходзіць паміж гарадамі Сьюдад-Хуарэс (штат Чыўаўа) і Санленд-Парк (штат Нью-Мехіка).

## Кенія ўвяла самыя строгія ў свеце меры па барацьбе з поліэтыленавымі пакетамі

Новыя абмежавальныя меры датычацца выкарыстання, продажу, вытворчасці і ўвозу пакетаў. Выключэнне складаюць вырабы прамысловага прызначэння. Мінімальны штраф за парушэнне забароны складае 19 тысяч долараў, максімальны — 38 тысяч долараў. Закон таксама прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі да чатырох гадоў. Раней аб прыняцці падобных мер заявілі ўлады 40 краін, у тым ліку шэраг афрыканскіх дзяржаў, сярод якіх Камерун, Гвінея-Бісаў, Малі, Танзанія, Уганда, Эфіопія, Маўрытанія і Малаві.

**Калектыў выдавецтва «Народная асвета» выказвае глыбокія спачуванні начальніку ўпраўлення выдавецкай дзейнасці і гандлю Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Паўлавай Алене Савельеўне ў сувязі са смерцю БАЦЬКІ.**

**Калектыў РУП «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» выказвае спачуванні начальніку ўпраўлення выдавецкай дзейнасці і кніжнага гандлю Міністэрства інфармацыі Паўлавай Алене Савельеўне ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Калектыў выдавецтва «Беларусь» выказвае глыбокае спачуванне начальніку ўпраўлення выдавецкай дзейнасці і гандлю Міністэрства інфармацыі Паўлавай Алене Савельеўне ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Калектыў ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа» выказвае глыбокае спачуванне начальніку ўпраўлення выдавецкай дзейнасці і гандлю Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Паўлавай Алене Савельеўне ў сувязі са смерцю БАЦЬКІ — Паўлава Савелія Яфімавіча.**

■ Ва ўрадзе

# ДВА СЦЭНАРЫІ ДЛЯ ЭКАНОМІКІ

## У Савеце Міністраў завяршаюць работу над прагнознымі дакументамі на 2018 год

**На пасяджэнні Савета Міністраў разгледзелі праекты прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2018 год і параметры асноўных паказчыкаў на 2019—2020 гады. Не абмінулі і асноўныя кірункі грашова-крэдытнай палітыкі краіны і рэспубліканскага бюджэту налета. Як адзначыў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ, зараз фактычна завяршаецца этап фарміравання прагнозных дакументаў перад тым, як накіраваць іх на разгляд кіраўніку краіны. Увесь пакет павінен быць прадстаўлены Прэзідэнту да 1 верасня.**

### Прагназуецца рост ВУП на 3,4%

«З улікам прынцыповых рашэнняў, прынятых 16 жніўня Прэзідыумам, дасягнута разуменне па асноўных ранейшых рознагалоссях. Што датычыцца прагнозных дакументаў, то ў параўнанні з тым, што мы разглядалі на Прэзідыуме, сур'ёзных змен не адбылося. За аснову па-ранейшаму ўзятыя два сцэнарыі развіцця эканомікі ў залежнасці ад розных знешніх і ўнутраных умоў — кансерватыўны для бюджэту і мэтавы для прагнозу», — растлумачыў Андрэй Кабякоў.

Паводле яго слоў, найважнейшыя параметры прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2018 год не змяніліся. Так, па ВУП чакаецца рост на 3,4%, па прадукцыйнасці працы — на 2,8%, па экспарце тавараў і паслуг — на 6%. Пры гэтым практычна дасягаецца збалансаванасць у знешнім гандлі. Пры агульным знешнегандлёвым абароце ў амаль 70 млрд долараў сальда прагназуецца блізкім да нуля (прыблізна мінус 30 млн долараў, або 0,1% да ВУП). Плануецца прыцягненне 1,45 млрд долараў прамых замежных інвестыцый. Інфляцыя ў перыяд снежань да снежня плануецца не вышэй за 7%, а сярэднегадавая — не больш за 7,4%. Па рэальных даходах насельніцтва ў 2018 годзе прагназуецца рост на 3,2%.

Андрэй Кабякоў таксама адзначыў, што ў адрозненне ад папярэдніх гадоў асаблівасцю прагнозу на наступны год з'яўляецца некаторае ўзмацненне ўплыву ўнутранага попыту на ВУП. У сувязі з гэтым застаецца важным збалансаваць такі фактар суразмерным укладам знешняга гандлю ў рост эканомікі, каб не стварыць дадатковага ціску на плацежны баланс. «Мінэканомікі разлічыла, што прагнозы развіцця знешніх рынкаў даюць магчымасць у 2018 годзе нарасціць валютную выручку на 2 млрд долараў. Асноўны прырост адбудзецца за кошт нарошчвання фізічных аб'ёмаў экспарту», — растлумачыў кіраўнік урада.

Па яго словах, існуючы прагноз забяспечвае збалансаваны рост эканомікі без залішняга ціску на фінансавы і валютны рынкі і, што важна, выхад на параметры росту, прадугледжаныя пяцігадовай праграмай. Бюджэт таксама не зведаў канцэптуальных змен. Губернатарамі і міністрамі падымаліся прынцыповыя пытанні па выкарыстанні дарожнага фонду, міжбюджэтных трансфертаў, падтрымцы экспарту.

Паводле інфармацыі Мінфіна, незадаволенымі застаюцца заяўкі асобных органаў дзяржаўнага кіравання на суму каля 665 мільёнаў рублёў. «Спачатку трэба зарабіць і пакласці ў бюджэт, а потым размяркоўваць. Незабяспечаных даходамі выдаткаў бюджэт несці не павінен і не будзе. Такое рашэнне прынята на пасяджэнні Прэзідыума, і прашу да гэтай тэмы не вяртацца. Магчымасці бюджэту маюць свае межы», — рэзюмаваў Андрэй Кабякоў.

### Бюджэтнікам — не менш, чым 750 рублёў

Паводле слоў Андрэя Кабякова, сярэдні заробак у бюджэтнай сферы ацэньваецца на ўзроўні 600 рублёў. «Гаворачы аб заробках бюджэтнікаў, першапачаткова зыходзім з прадугледжаных праектам бюджэту рэсурсаў. Гэта значыць, што па кансерватыўным сцэнарыі тэмп росту ВУП асцярожна ацэньваецца ў 101,2%. Калі даходы бюджэту будуць вышэйшыя за кансерватыўны сцэнарый, то дадатковыя сродкі будуць акумулявацца ў спецыяльных рэзервовых фондах», — удакладніў Андрэй Кабякоў. Для гэтых мэт праектам закона аб бюджэце прадугледжана норма аб фарміраванні ў рэспубліканскім і мясцовых бюджэтах такіх спецыяльных фондаў.

Мяркуецца, што эканоміка зможа згенераваць даходы фондаў у аб'ёме, дастатковым для павышэння сярэдняга заробку налета ў бюджэтнай сферы да ўзроўню не менш як 750—760 рублёў, каб захаваць яго суадносіны да сярэдняга заробку па краіне на ўзроўні 75—76%. «Але паралельна неабходна актыўна рэалізоўваць мерапрыемствы па аптымізацыі структуры і скарачэнні выдаткаў бюджэтных арганізацый, павелічэнні даходаў ад пазабюджэтнай дзейнасці. У праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады запісана, што гэтыя суадносіны сярэдняй зарплаты ў бюджэтнай сферы да сярэдняй зарплаты па краіне павінны быць на ўзроўні 80%. Мы пакуль знаходзімся толькі ў пачатку шляху па выкананні палажэння праграмы», — падкрэсліў кіраўнік урада.

Пры гэтым ён растлумачыў, што ў рэальным сектары рост заробкаў павінен быць забяспечаны ростам прадукцыйнасці працы. «Звязванне грошай будзе адной з ключавых тэм, каб заробак у адну тысячу рублёў не спраўкаваў рост спажывецкага імпарту і павышаны попыт на валюту», — рэзюмаваў Андрэй Кабякоў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Энергетычная бяспека

# Рост дабрабыту з атамнай магутнасцю

**Расійскія журналісты і эксперты ў галіне атамнай энергетыкі азнаёміліся з тым, як праходзіць будаўніцтва Беларускай АЭС на Гродзеншчыне. Падчас прэс-тура госці змаглі пабываць на будаўнічай пляцоўцы, ацаніць развіццё інфраструктуры горада Астраўца і задаць найбольш цікавыя ім пытанні адміністрацыі раёна і намесніку міністра энергетыкі Міхаілу МІХАДЗЮКУ.**



### «Злезці» з газавай іголкі

Сёння 96% электраэнергіі ў Беларусі выпрацоўваецца дзякуючы прыроднаму газу. Кошт яго пастаянна вагаецца, што негатыўна адбіваецца на канкурэнтаздольнасці эканомікі краіны. Знізіць залежнасць ад імпарту прыроднага газу ў Беларусь дазволіць будаўніцтва АЭС. «Паводле ацэнак спецыялістаў, зварот да мірнага атама дазволіць адмовіцца ад закупкі каля 5 млрд кубічных метраў прыроднага газу і знізіць яго спажыванне ў энергетыцы. Тарыфы на электраэнергію для рэальнага сектара эканомікі таксама будуць зніжаны. Акрамя таго, паводле ацэнак навукоўцаў, атамная станцыя дазволіць памяншыць выкід парніковых газаў у атмасферу на 7—10 млн тон», — растлумачыў Міхаіл Міхадзюк.

Паводле яго слоў, атамная станцыя дазволіць не толькі ствараць энергію. «Вакол яе неабходна ствараць мноства вытворчасцяў, павысіць узровень навукі ў краіне. Гэта станоўча адаб'ецца на інтэлектуальным развіцці ўсяго грамадства. Акрамя таго, праз станцыю мы наблізімся да пераходу на шосты тэхналагічны ўклад», — лічыць намеснік міністра энергетыкі.

Пры гэтым ніхто не забывае, што Беларусь больш за ўсіх пацярпела пасля трагедыі на Чарнобыльскай АЭС. «Калі мы пачыналі нашу атамную энергетычную праграму, толькі чвэрць насельніцтва падтрымлівала будаўніцтва АЭС у краіне згодна з праведзеным сацыяльным апытаннем. Мы іх праводзім кожны год. Цяпер каля 60% грамадзян відавочна падтрымліваюць будаўніцтва БелАЭС. У Астраўцы сёння яго падтрымліваюць 83% жыхароў. Сусветная практыка сведчыць, што калі стварэнне такіх аб'ектаў падтрымлівае 50% насельніцтва, то гэта станоўчы вынік», — растлумачыў Міхаіл Міхадзюк. На яго думку, такога выніку змаглі дасягнуць дзякуючы адкрытасці БелАЭС. Усе ведаюць пра тое, што сёння ў краіне будуецца самы сучасны праект пакалення «3+», у якім павінны прымяняцца як актыўныя, так і пасіўныя сістэмы бяспекі.

### Згодна з планам

Каб зрабіць станцыю бяспечнай і эфектыўнай, па словах намесніка міністра энергетыкі, у яе будаўніцтва ўжо ўкладзена каля 2,7 млрд долараў. Міхаіл Міхадзюк нагадаў, што расійскі бок таксама выдаў Беларусі дзяржаўны экспартны крэдыт на суму да 10 млрд долараў для фінансавання 90% кошту кантрактаў па будаўніцтве АЭС.

Станцыя ў Астраўцы ўзводзіцца расійскім бокам пад ключ, генеральным падрадчыкам выступае кампанія «Атамбудэкспарт». Для рэалізацыі праекта БелАЭС з расійскім бокам падпісаныя міжурадавыя пагадненні, у тым ліку аб супрацоўніцтве ў галіне выкарыстання атамнай энергіі ў мірных мэтах, у будаўніцтве атамнай электрастанцыі, у сферы ядзернай бяспекі.

Кажучы пра графік будаўніцтва, намеснік міністра адзначыў, што планы ўвесці першы энергаблок у 2019 годзе, другі — у 2020-м сёння пацвярджаюцца «Расатамам».

Корпус рэактара для другога энергаблока даставяць з Расіі на БелАЭС у верасні, а да канца гэтага года пачнуць яго мантаж. Нагадаем, што на першым энергаблоку корпус рэактара і ўсе чатыры парагенератары ўжо зманціраваны. Завяршылася зварка галоўнага цыркуляцыйнага трубаправода першага энергаблока — гэта ключавая падзея для падрыхтоўкі да запуску першага блока. Паводле слоў Міхаіла Міхадзюка, усе кантракты на пастаўку асноўнага абсталявання падпісаныя, значная частка ўжо адпраўлена расійскімі заводамі-вытворцамі ў Астравец. «Абсталяванне для АЭС праходзіць шматступенчаты кантроль якасці на ўсіх этапах вытворчасці і непасрэдна пры паступлённі на пляцоўку станцыі», — падкрэсліў намеснік міністра.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Армія

# ФАКТАР МІРУ І СПАКОЮ

## Сумеснае стратэгічнае вучэнне «Захад—2017» мае выключна абарончы характар і не нясе ніякай пагрозы



**Аб гэтым падчас брыфінгу паведаміў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны Беларусі генерал-маёр Алег БЕЛАКОНЕЎ, які кіруе вучэннем ад беларускага боку. Беларуска-расійскае вучэнне пройдзе з 14 па 20 верасня на тэрыторыі нашай краіны і на трох палігонах Расійскай Федэрацыі.**

Яго тэма — падрыхтоўка і прымяненне груповак войскаў (сіл) у інтарэсах гарантавання ваеннай бяспекі Саюзнай дзяржавы. Для рэалізацыі пастаўленых задач будзе задзейнічана каля 12 700 ваеннаслужачых.

Але чым бліжэй падзея, тым больш ажыятажу вакол яе. Як зазначыў Алег Белаконеў, падрыхтоўка да вучэння праходзіць на фоне няпростай ваенна-палітычнай абстаноўкі ў рэгіёне. «Каля заходніх межаў Саюзнай дзяржавы, у краінах Балтыі і ў Польшчы, створаны перадавыя цэнтры НАТА, — заўважыў ён. — Актыўна, практычна змяняючы адно другім, арганізацыя праводзіць вучэнні, у ходзе якіх у тым ліку адпрацоўваюцца пытанні прымянення войскаў у непасрэднай блізкасці да дзяржаўных межаў Рэспублікі Беларусь. Іншымі словамі, ідзе асваенне новага тэатра ваенных дзеянняў».

— Беларусь не бачыць у гэтым пагрозы нацыянальнай бяспецы, і мы становімся да вучэнняў НАТА абсалютна адэкватна, — падкрэсліў першы намеснік міністра абароны. — Працэс будаўніцтва і развіцця ўзброеных сіл любой дзяржавы не завершаны. Апрабацыя ўсіх новых формаў і спосабаў ажыццяўляецца, вядома ж, падчас вучэнняў. У сувязі з гэтым незразумелы ажыятаж вакол вучэння «Захад—2017». Любога роду вучэнні — адздзялення, батальёна або шматнацыянальных груповак — і прызначаны для таго, каб праверыць сумяшчальнасць сістэмы кіравання, здольнасць сумесным кантынгентамі войскаў выканаць пастаўленыя задачы. Таму неадэкватна рэагаваць на падрыхтоўку нашых войскаў, па меншай меры не зусім карэктна.

Вучэнне «Захад—2017» з'яўляецца галоўным і завяршальным этапам у сістэме сумеснай падрыхтоўкі ўзброеных сіл Беларусі і Расіі. Рэгіянальная групоўка войскаў, якая будзе адпрацоўваць вучэбна-баявыя задачы падчас вучэння, прызначана для гарантавання бяспекі ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне калектыўнай бяспекі. Таму навучанне дадзеных войскаў з'яўляецца фактарам забеспячэння міру і спакою ў Еўрапейскім рэгіёне.

— Нягледзячы на тэндэнцыйны ажыятаж, створаны вакол вучэння, Беларусь няўхільна выконвае ўсе ўзятыя на сябе абавязацельствы ў межах міжнародных і рэгіянальных дагавораў па разбраенні, верыфікацыйнай дзейнасці, умацаванні мер даверу і бяспекі ў межах ААН і АБСЕ, — зазначыў кіраўнік вучэння ад беларускага боку. — Для назірання за меркаваным вучэннем накіраваны запрашэнні прадстаўнікам міжнародных арганізацый, а таксама ваенна-дыпламатычнага корпуса замежных дзяржаў, акрэдытаваных пры пасольствах сваіх краін у Беларусі. Дадаткова чакаецца прыбыццё ваенных назіральнікаў з Латвіі, Літвы, Польшчы, Украіны, Эстоніі, Швецыі і Нарвегіі.

Па заканчэнні вучэння да 30 верасня асабовы склад, узбраенне, ваенная і спецыяльная тэхніка Узброеных Сіл Беларусі вернуцца ў пункты пастаяннай дыслакацыі, а вайсковыя часці і падраздзяленні Узброеных Сіл Расіі пакінуць тэрыторыю нашай краіны.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

# З ладдзі — на паветраны шар

### Што застанецца?

Але ж святы маюць адну праблему: яны хутка праходзяць. А што застаецца? Мноства ўражанняў, новыя знаёмствы, а таксама — абноўлены горад — сталіца святкавання, адрамантаваныя дарогі і будынкі, новыя помнікі. Вось і ў Полацку — і гэта відаць ужо зараз — выдатна папрацавалі напярэдадні свята, засталіся апошнія штрыхі і самы старажытны горад краіны паўстане перад намі прыбраны, пачышчаны, нібыта вымыты. І справа не толькі ў святочных упрыгажэннях, якія хутка знікнуць на ветры часу, але ў стаўленні саміх палачан да справы падрыхтоўкі. Сустракаючы гасцей, заўсёды імкнешся пакінуць добрыя ўражанні.

— Свята пісьменства — выдатны стымул для горада, магчымасць паказаць сябе з лепшага боку — як знешняга, так і ўнутранага, — гаворыць першы **намеснік старшыні Полацкага райвыканкама Сяргей ЛЕЙЧАНКА.** — Працы зроблена сапраўды шмат, калі летась пачыналі рыхтавацца, вывучалі, што трэба зрабіць, то першапачатковы план уключаў каля 250 аб'ектаў. Але калі праца пачалася, зразумелі: трэба рабіць больш, каб не было кантрастаў паміж адрамантаванымі і неадрамантаванымі будынкамі, балконамі, фасадамі. У выніку работы ахапілі каля 400 аб'ектаў. Ведаеце, спрацавала і заканамернасць, калі адзін сусед робіць рамонт, то і другі імкнецца паказаць, што ён не горшы, і таксама дарабляе тое, да чаго раней рукі не даходзілі.

Улады звярнуліся з просьбай і да мясцовых жыхароў, каб тэрыторыі каля іх дамоў таксама былі крыху ўпарадкаваныя, выглядалі дагледжанымі. І многія адгукнуліся. Падтрымалі справу рамонту горада многія прадпрыемствы, а сродкі паступалі з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў.

— Калі цэлы год займаешся адной справай, то не заўважаеш змен, якія паступова адбываюцца, але зараз, азіраючыся на зробленае за год, разумеем, што зрабілі многа сапраўды важнага. Ды і жыхары прывыклі, што горад увесь час абнаўляецца і ўдасканальваецца, таму самі маюць больш высокія патрабаванні і да ўласнага жыцця, працы, жылля, — дадае Сяргей Дзмітрыевіч.

Адрамантавалі чыгуначны і аўтавакзал, абнавілі ўезд у Полацк з боку Наваполацка. На вуліцах горада з'явіліся новыя сучасныя павільёны «Віцебскаблсаюздруку», адрамантаваныя жылыя дамы на вуліцы Камуністычнай, а будынак «Белтэлекама» пасля рамонту сапраўды ўражвае! Дызайн мінімалістычны, сучасны і вельмі стылёвы, адпаведны профілю прадпрыемства. Дарэчы, у гэтыя дні адкрые дзверы пасля рамонту і Палац культуры, абсталяваны сучаснай тэхнікай. Безумоўна, ён стане сапраўдным цэнтрам, што аб'яднае многіх аматараў айчыннай песні, тэатра. Плануецца, што тут будуць рэгулярна ладзіцца канцэрты мясцовых калектываў, запрацуе тэатр імя Сімяона Полацкага, а з пастаноўкамі змогуць прыязджаць і сталічныя акцёры. Дарэчы, першыя гастролі могуць адбыцца ўжо сёлета, была выказана ідэя прывезці ў Полацк спектакль, прысвечаны Францыску Скарыну, — з Мінска ці Магілёва.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Кнігарня «Светач-Полацк» гасцінна прымае пакупнікоў у абноўленых залах; у ліку самых запатрабаваных тавараў — постары да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

### ... і абноўленая кнігарня

Адным з самых вялікіх падарункаў горада сталася абноўленая кнігарня «Светач-Полацк» ААТ «Белкніга», якая літаральна тыдзень таму зноў адчыніла дзверы для наведвальнікаў. Прасторныя і светлыя гандлёвыя залы, лічбавыя даведачна-інфармацыйныя табло з анонсамі і магчымасцю пошуку кніг у асартыменце магазіна, дзіцячы куток з яркімі крэсламі, вялікі аддзел выданняў для дзяцей і зручная канапа, на якой можна на хвілінку прысесці з кнігай. Арыгінальныя і стылёва афармленыя вітрыны і вялікі аддзел сувеніраў. Многія з іх могуць стаць добрым напамінам пра свята. Нататкі з выявай Францыска Скарыны, календары з сімваламі 500-годдзя кнігадрукавання, нават самі плакаты карыстаюцца попытам у мясцовых жыхароў. Прыярытэт аддаецца беларускай літаратуры, новыя кнігі айчынных аўтараў можна пабачыць адразу каля ўвахода. А сучасныя стэлажы дазваляюць размяшчаць тавар «тварам» да пакупніка.

— За тры месяцы, што ішоў рамонт кнігарні, палачане засумавалі па кнігах. Гэта адчуваецца па тым радасным настроі, з якім пакупнікі завітваюць да нас, — кажа **загадчыца кнігарні «Светач-Полацк» Маргарыта ЛЕВАНЕНКА**. — Падчас рамонту — а яго ў нас не было больш як 20 гадоў — абнавілася ўсё — ад падлогі да столі. За тыя некалькі дзён, што кнігарня зноў прымае наведвальнікаў, рост продажаў склаў больш як 150% у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Наш горад — радзіма беларускага кнігадрукавання, тут маюць карані выдатныя пісьменнікі, таму вельмі важна мець сваю дастойную кніжную краму. Пакуль ішоў рамонт, усе пытанні вырашаліся вельмі хутка, аператыўна, кіраўніцтва «Белкнігі» ішло нам насустрач.

Важна, што ў дні правядзення Свята беларускага пісьменства ў Полацку кнігарня «Светач» будзе працаваць у рэжыме, суаднесеным з праграмай святкавання.



Скульптар Уладзімір ПІПІН сочыць за работай па ўстаноўцы помніка «Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці».

### Адкуль пачалася Беларусь?

У гэтыя дні ў Полацку віруе жыццё. Літаральна каля кожнага помніка, храма праходзяць важныя падзеі. Вось, напрыклад, каля Сафійскага сабора мы сустрэлі скульптара Уладзіміра Піпіна, якраз у той час, калі адбывалася ўстаноўка новага помніка «Полацк — калыска беларускай дзяржаўнасці».

— Гэтым помнікам мы паставілі кропку над «і» ў пытанні, адкуль мы пайшлі. Пунктам адліку з'яўляецца дата 862 год, каб ніхто больш не блытаўся, адкуль пачалася Беларусь. На гэтых сімвалічных шчытах — вобразы шасці асоб — пантэон тых людзей, з якіх пачалася наша незалежная дзяржава. Яны ў суровай барацьбе здабылі аснову таго, што мы сёння маем. Як пісаў Алесь Разанаў, «Пачатак — ад Рагвалода», — кажа **аўтар помніка, скульптар Уладзімір ПІПІН**. Менавіта яго работа стала пераможцам рэспубліканскага конкурсу.

Месца, дзе ўстаноўлены помнік, таксама сімвалічнае, гэта той цэнтр некалі магутнага Полацкага княства, дзе зарадзілася дзяржава. Тут, на беразе Заходняй Дзвіны, дзе ўзвышаецца велічны Сафійскі сабор, стваралася наша гісторыя. Так, гэтая сімвалічная ладдзя, што лунае над хвалямі, будзе нагадваць і нам, беларусам, пра нашы карані, і гасцям расказваць пра нас, пра слаўных князёў Рагвалода, Усяслава, пра мудрых Еўфрасінню і Рагнеду. Сам скульптар прызнаўся, што ў момант, калі ладдзя на тросах лунала па-над узгоркам, сэрца сціслася ад разумення значнасці гэтай хвіліны, яе сапраўднай гістарычнасці, якая застанецца ў памяці назаўжды.

Шпацыруючы па праспекце Скарыны, сустракаем яшчэ аднаго госця са сталіцы. Каб прасачыць за падрыхтоўкай да «Полацкіх чытанняў», што пройдуць у Полацкім дзяржаўным універсітэце, сюды завітаў **дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі Ігар КАПЫЛОЎ**. На пытанне, ці гатовы горад да свята, ён не вагаючыся адказвае:

— Думаю, Полацк да свята гатовы. Гэта датычыцца не толькі матэрыяльнага боку, але і настрою кіраўнікоў, арганізатараў, ды і саміх гараджан. Сёлета, у Год навукі варта звярнуць асаблівую ўвагу на навуковы складнік свята. Універсітэт падышоў з поўнай адказнасцю да падрыхтоўкі навуковага форуму, сюды завітаюць вядучыя гуманітарыі на чале са старшынёй Прэзідыума НАН Беларусі акадэмікам Уладзімірам Гусаковым і акадэмікам-сакратаром Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Аляксандрам Каваленем.

Па словах Ігара Лявонцьевіча, ужо сама атмасфера сярэднявечнага ўніверсітэта, утульны двор і аўдыторыі настройваюць на патрэбны лад і ствараюць атмасферу панавання навукі і кніжнасці.

... Гаспадары з нецярпеннем і хваляваннем чакаюць свята. Загучыць музыка, пачнецца шэсце, і агульную хвалю будзе «не спыніць, не стрымаць». Упершыню за гісторыю правядзення Дня беларускага пісьменства свята ў Полацку будзе доўжыцца два дні. Як кажуць мясцовыя, Полацк не памятае такіх маштабных свят, бо яно аб'ядноўваецца з Днём горада, што адзначаць 1 верасня, і фэстам сярэднявечнай культуры «Рубон». Статус самага старога горада краіны абавязвае адпавядаць найвышэйшым патрабаванням. Сталіца самай першай беларускай дзяржавы мусіць стаць сапраўдным цэнтрам кніжнасці, культуры. А гэта асабліва знакава сёлета, у год святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання, пачатак якому паклаў Францыск Скарына з Полацка...

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## У добры шлях!

# «Дарога да Святыняў» яднае ўсіх

Сёння ад сцен мінскага Свята-Духавага кафедральнага сабора пасля малебну і блаславлення адпраўляецца чарговая штогадовая навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў», якая нясе з сабой Дабратворны Агонь, запалены каля Гроба Гасподняга. Як у кожны з дваццаці трох папярэдніх гадоў, экспедыцыя мае на мэце шырока распаўсюджваць веды пра гісторыю Беларусі і яе праваслаўнай царквы, праводзіць творчыя сустрэчы ў сценах устаноў культуры і адукацыі, наведваць бальніцы, сацыяльныя прытулкі, праводзіць памінальнае набажэнства на месцах пахавання абаронцаў Айчыны. Разам з жыхарамі гарадоў і вёсак паломнікі будуць садзіць дрэўцы агульнага саду Малітвы. У складзе экспедыцыі — вядомыя айчынныя навукоўцы, пісьменнікі, дзеячы культуры і мастацтва.

Лампаду, запаленую ад Дабратворнага Агню каля Гроба Гасподняга ў Іерусаліме, удзельнікі экспедыцыі прынясуць сёння супольным хрэсным ходам на Святое поле пад Баранавічамі, у храм вёскі Сталовічы таго ж раёна. Затым экспедыцыя пабывае ў гарадскім пасёлку Радунь і блізкім да яго раённым цэнтры Воранава. У апошні дзень жніўня ўдзельнікі экспедыцыі сустрэнуцца з жыхарамі горада Астравец, гарадскога пасёлка Варапаева, аграгарадка Порплішча. 1 верасня экспедыцыю сустрэнуць у Докшыцах, Бягомлі, Лепелі. 2 верасня маршрут праляжа па Ушацкім раёне. Месцам завяршэння пяцідзённага паломніцтва па традыцыі стане сталіца Дня беларускага пісьменства.



Удзельнікі экспедыцыі ў час памінальнага набажэнства на Святым полі пад Баранавічамі, дзе пахаваныя ахвяры баёў мінулых стагоддзяў (фота 2016 года).

На сайце газеты «Звязда» можна будзе штодзень знаёміцца з фотарэпартажамі пра тое, што ўбачылі ўдзельнікі экспедыцыі на сваім шляху праз Мінскую, Брэсцкую, Гродзенскую, Віцебскую вобласці.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.** *pyasecki@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
30 жніўня 2017 г.
№32 (416)

ДОБРАЯ НАВІНА

## Праектам зацікавіліся

### Індыйская фармацэўтычная кампанія мае намер супрацоўнічаць з Беларуссю

**У найбліжэйшыя гады ў нашай краіне павінна з'явіцца сумеснае індыйска–беларускае прадпрыемства па вытворчасці лекаў. Падчас сустрэчы з прадстаўнікамі фармацэўтычных кампаній абодвух бакоў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ заслухаў, у якім кірунку развіваецца супрацоўніцтва.**

— Мы актыўна займаемся развіццём нашага прадпрыемства «Акадэмфарм», і можна сказаць, што ўжо створаны дастаткова магутны фармацэўтычны кластар, — запэўніў **галоўны інжынер рэспубліканскага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Акадэмфарм» Міхаіл ГАЎРЫЛАЎ.** — Наш калега і прадстаўнік індыйскага боку доктар Лаліт прыехаў з добрай навіной: індыйская кампанія дала згоду на сумеснае супрацоўніцтва. Ужо з'явілася вельмі цікавая прапанова па стварэнні шэрагу новых прэпаратаў. Таму гэты кірунак супрацоўніцтва падаецца надзвычай важным, асабліва калі вытворчасць удасца наладзіць.

**Дырэктар кампаніі «Чакані-Фарма» доктар Лаліт ЧАКАНІ** у сваю чаргу пацвердзіў, што індыйскія фармацэўты зацікаўленыя сумесным праектам і ў будучыні гатовыя прапанаваць да вытворчасці новыя, яшчэ больш дзейсныя прэпараты.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

ТЭМА ДНЯ

# АДХОДАМ ДАДУЦЬ ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

### А ў краіне з'явіцца дэпазітная сістэма абыходжання з імі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Батарэйкі, папера, упакоўка, пілавінне, масла, шыны... Аб'ём адходаў, якія стварае чалавецтва, велізарны. Толькі летась у Беларусі было сабрана 599 з паловай тысяч кубаметраў другаснай сыравіны са смецця. А ўзровень перапрацоўкі зараз складае 16%. Мала гэта ці шмат?**

стар. 4

КРУГЛЫ СТОЛ

# ПАТРАБУЮЦЦА ЎНІВЕРСАЛЫ

### У Бабруйску шукалі «рэцэпт» паспяховай дзейнасці рэгіянальных СМІ



**Што неабходна рабіць, каб адпавядаць запытам чытацкай аўдыторыі, чаго не хапае для папулярнасці мясцовым друкаваным сродкам інфармацыі, што з сябе павінна ўяўляць сучасная рэдакцыя, ці магчыма раённую прэсу зрабіць самаакупнай... Міністэрства інфармацыі разам з Выдавецкім домам «Звязда» прапанавалі абмеркаваць праблемы рэгіянальных СМІ і выпрацаваць найбольш эфектыўныя шляхі іх вырашэння. У Бабруйску за круглым сталом сабраліся тыя, хто ставарае і фарміруе ў краіне інфармацыйную прастору: намеснік міністра інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, дырэктар — галоўны рэдактар «Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ, прадстаўнікі масмедыя краіны, кіраўніцтва Бабруйскага гарвыканкама. Удзел у размове прыняла і намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Валянціна РАЖАНЕЦ.**

**Перад тым як пачаць абмеркаванне, удзельнікі наведалі рэдакцыю газеты «Бабруйскае жыццё», якая сёння спалучае ў сабе друкаваную версію, сайт, радыё, сацыяльныя сеткі, вось-вось запрацуе тэлебачанне. Выданне за кароткі тэрмін цалкам выйшла з ліку стратных. Гэты вопыт стаў адным з наглядных прыкладаў таго, у якім кірунку трэба развівацца.**

**«МС» прапануе азнаёміцца з найбольш цікавымі думкамі ўдзельнікаў круглага стала.**

стар. 3

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# І СУТНАСЦЬ ВАЖНАЯ, І ФОРМА

*Спікер верхняй палаты парламента заклікаў актывізаваць супрацоўніцтва з Новасібірскам*

**Не абмяжоўвацца продажам, а шукаць новыя, больш дзейсныя формы ўзаемадзеяння з Новасібірскай вобласцю — да гэтага заклікаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на нарадзе па пытаннях развіцця супрацоўніцтва Беларусі з расійскім рэгіёнам.**



Фота БЕЛТА.

У апошнія гады тавараабарот Беларусі і Новасібірскай вобласці расце, але гэта не павінна стаць нагодай для расслаблення. Па словах спікера верхняй палаты, тэмпы росту экспарту паляпшаюцца на фоне не самага спрыяльнага мінулага года. Аднак ім яшчэ далёка да тых лічбаў, якіх дасягнулі ў 2012—2014 гадах, калі сітуацыя з двухбаковым гандлем была значна лепшай.

«Таму таксама павінны выкарыстоўвацца новыя формы супрацоўніцтва», — лічыць старшыня Савета Рэспублікі. Варта наладжваць і развіваць парламенцкія сувязі, скарыстаць той патэнцыял, якім валодае беларуская і новасібірская моладзь, вырашаць пытанні паставак беларускай тэхнікі, прадуктаў харчавання, мяркуе парламентарый.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

# ПАМІЖ МАЦЕРЫКАМІ

*Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Егіпта наведаў Мінск*

**Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва — адзін з кірункаў, які можна больш інтэнсіўна развіваць у беларуска-егіпецкім партнёрстве, уцягваючы ў гэты працэс новыя тэрыторыі. Такую думку выказаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ на сустрэчы з міністрам замежных спраў Арабскай Рэспублікі Егіпет Самехам ШУКРЫ.**

Міхаіл Мясніковіч акрэсліў яшчэ некалькі сфер, у якіх, на яго думку, можна было б актывізаваць дыялог. «Міжпарламенцкія кантакты маглі б быць больш дынамічнымі, што спрыяла б паўнавартаснаму палітычнаму дыялогу». Для гэтага старшыня Савета Рэспублікі прапанаваў выкарыстоўваць патэнцыял парламенцкіх груп дружбы. У Беларусі такая ўжо створана, чарга — за егіпецкімі калегамі. Яшчэ адзін кірунак — інвестыцыйнае супрацоўніцтва, гэта магчымасць сканцэнтраваць больш увагі на рэалізацыі ўнікальных праектаў на новых тэхналогіях. Беларусь гатова ажыццяўляць трансфер тэхналогій па ўзгодненых праектах. Асобна Міхаіл Мясніковіч адзначыў маладзёжнае супрацоўніцтва і адукацыйныя праекты.

**Надзея АНІСОВІЧ.** anisovich@zviazda.by

# ЯК РОБІШ, ТАК І МАЕШ

*Аляксандр Папкоў лічыць, што патэнцыял Аршанскага раёна пакуль не да канца выкарыстаны*

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандр Папкоў узяў удзел у пасяджэнні Аршанскага райвыканкама.**

Падчас яго былі разгледжаны вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця і выканання бюджэту раёна за першае паўгоддзе 2017-га, а таксама рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва на 2016—2020 гады ў кірунку сацыяльнай інтэграцыі і падтрымкі інвалідаў і пажылых людзей.

Выступаючы на пасяджэнні, Аляксандр Папкоў адзначыў, што Аршанскі раён з'яўляецца адным з валаўтваральных у галіне, аднак узровень яго развіцця і ўклад у эканоміку павінен быць значным. Кіраўніцтву райвыканкама рэкамендавана ўдзяліць асаблівую ўвагу павышэнню канкурэнтаздольнасці рэгіёна, нарошчванню аб'ёмаў і эфектыўнасці вытворчасці тавараў і паслуг, развіццю малога і сярэдняга бізнесу, сельскагаспадарчых арганізацый, стварэнню новых працоўных месцаў.

Таксама старшыня камісіі наведаў Багушэўскі сельсавет Сенненскага раёна, дзе абмяркоўваліся перспектывы развіцця гарадскога пасёлка Багушэўск.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** pustavit@zviazda.by

АКТУАЛЬНА

# СОСНЫ Ў НЕБЯСПЕЦЫ!

**Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні сумесна з Інстытутам лесу НАН Беларусі і Міністэрствам лясной гаспадаркі разгледзела наступствы масавага знішчэння лесу насякомымі-шкоднікамі на тэрыторыі Беларусі і метады барацьбы з імі. Толькі за 7 месяцаў гэтага года больш за 12 тысяч гектараў сасновага лесу пацярпела ад вяршыннага і шасцізубага караеда.**

**Каб выратаваць таварную драўніну, у тэрміновым парадку на гэтай вялізнай тэрыторыі прыйшлося высечы амаль 2 мільёны кубічных метраў пашкоджаных дрэў.**



Знішчэнне жуком сасны ў лясах Беларусі расце ў геаметрычнай прагрэсіі. Яшчэ летась высечкі пашкоджаных і расстроеных хвойных насаджэнняў не дасягалі і 4 тысяч гектараў!

«Біялагічным пажарам» у лясах называюць спецыялісты нашэсце жукоў-караедаў. А пачыналася ўсё з высыхання елак. 3-за зніжэння ўзроўню грунтавых водаў яловым лясам стала не хапаць вільгаці. Вось тут і сталі размнажацца шкодныя насякомыя. Яны, як правіла, нападаюць на біялагічна аслабленыя дрэвы.

— Становішча абвастрылася з-за прыродных анамалій апошніх двух гадоў, — каментуе сітуацыю **доктар сельскагаспадарчых навук, намеснік дырэктара Інстытута лесу Уладзімір УСЕНЯ.** — Наступствы засухі і ўраганаў прывялі да аслаблення сасновых насаджэнняў, якія страцілі біялагічную ўстойлівасць і сталі прынадай для жукоў-караедаў. Цяпер трэба аператыўна выяўляць пашкоджаныя ўчасткі лесу і адразу ж, пакуль шкоднік не прыбяў да канчатковай непрыдатнасці драўніну, праводзіць санітарную высечку дрэў.

Самыя шырокія ачагі пашкоджання сасновых лясоў выяўлены ў паўднёвых рэгіёнах краіны — у Брэсцкай, Гомельскай, часткі Мінскай і ў Магілёўскай абласцях. Масавае ўсыханне дрэў атрымала назву «караеднае ўсыханне сасны». Насякомае пералятае па паветры і засяляецца ў верхнюю частку дрэва. Гэтая акалічнасць істотна ўскладняе барацьбу са шкоднікам, бо на вялікай вышыні яго цяжка выявіць.

Экалагічна бяспечным метадам барацьбы з жукамі-караедамі, паводле слоў спецыялістаў, з'яўляецца ферамонны нагляд, заснаваны на ўжыванні сінтэтычных эфірных прэпаратаў і пастак бар'ернага тыпу. Гэты метад дазваляе правесці адпаведны маніторынг і своечасова выявіць пашкоджаныя ўчасткі лясоў.

Цяпер на выратаванні сасновых лясоў працуе больш як 5 тысяч чалавек. Праводзяцца санітарна-аздараўленчыя высечкі дрэў з прыцягненнем юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў і мясцовых жыхароў. Максімальна спрошчана працэдура афармлення дазволаў на правядзенне гэтых работ, зменшана колькасць узгадненняў. Для грамадзян скарочаны тэрмін афармлення дакументаў на правядзенне высечак пашкоджанага лесу.

Завяршыць работы па ліквідацыі масавых ачагоў плануецца да 1 студзеня 2018 года. А да 1 чэрвеня 2018-га на высечаных участках плануецца пасадзіць маладыя дрэвы.

Ну а каб не дапусціць падобнай сітуацыі ў будучыні, Міністэрства лясной гаспадаркі сумесна з навукоўцамі распрацоўвае прагноз распаўсюджвання шкоднікаў на 2018—2019 гады. Акрамя таго, складзена тэхнічнае заданне і распачата работа па падрыхтоўцы комплекснай праграмы павышэння ўстойлівасці і аховы сасновых насаджэнняў у Рэспубліцы Беларусь ад шкодных арганізмаў.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

ШТО Ў ВАС НОВАГА?

# ПЛАНЫ НА ВОСЕНЬ

**Старшыні сельскіх Саветаў дэпутатаў расказалі, што новага адбылося на іх тэрыторыі на мінулым тыдні і якіх падзей яны чакаюць у хуткім часе.**

Сёлета «Дажынкі» ў Брэсцкай вобласці пройдуць у Давыд-Гарадку. **Старшыня Белавушскага сельскага Савета дэпутатаў Столінскага раёна Ірына ПІЛІПЧУК** расказвае, што праз аграгарадок Белавуша праходзіць сем кіламетраў трасы рэспубліканскага значэння Р88. Па ёй многія жыхары вобласці і накіруюцца на свята «Дажынак», таму цяпер увага ўдзяляецца добраўпарадкаванню цэнтральнай вуліцы і прывядзенню ў належны выгляд платоў і прыдамавых тэрыторый. Цэнтр аграгарадка ўпрыгожваюць кветкі і пасаджаныя туі. У планах на восень яшчэ паставіць лаўкі — гэта ў тым ліку запыт матуль, якія гуляюць там з дзецьмі.

Дарожным пытаннем займаюцца і на тэрыторыі Языльскага сельсавета Старадарожскага раёна. **Старшыня Языльскага Савета дэпутатаў Віктар ПАЛАЎЧЭНЯ** тлумачыць, што зараз на яго тэрыторыі падсыпаюць гравій і рамантуюць асфальт. У планах на восень — агарадзіць могілкі і знесці старыя дамы.

«Звароты грамадзян — паўсядзённая праца», — адзначае **старшыня Гвозніцкага сельскага Савета дэпутатаў Маларыцкага раёна Анатоль НАВАКОЎСКІ.** Апошнім часам да яго звяртаюцца па вылучэнне зямлі пад агародніцтва. Пад гэту справу аддаюць участкі і хаты, якія пустуюць, у вёсках на тэрыторыі сельсавета. Паволі яны і разыходзяцца — іх бяруць тыя, хто жадае займацца падсобнай гаспадаркай. Старшыня тлумачыць, што зямлю купляюць як мясцовыя жыхары, так і гараджане — пад дачы. Для сельсавета гэта ўзаемавыгадна: участак трымаюць у парадку нават тыя, хто прыязджае сюды толькі на выхадных. Пенсіянеры ж часам зусім пераязджаюць з горада ў вёску, каб быць бліжэй да прыроды.

**Старшыня Вайнілаўскага сельскага Савета дэпутатаў Чавускага раёна Ірына БУРДОВА** гаворыць, што асноўнае пытанне зараз — абмалот прысядзібных участкаў. Гэта першачарговая задача. Гаспадаркі завяршаюць уборку і пускаюць некалькі камбайнаў на абмалот тым гаспадарам, якія вырошчваюць свае збожжавыя культуры. Гаспадарка аказвае дапамогу ва ўборцы тэхнікай не задарма, вядома. Да таго ж у сельсавеце займаюцца рэалізацыяй вядомага Указа №100. На мінулым тыдні было слуханне па двух дамах: адзін дом адышоў сельсавету, другім будзе займацца спадчыннік.

**Надзея АНІСОВІЧ.** anisovich@zviazda.by

# ПАТРАБУЮЦЦА ЎНІВЕРСАЛЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

## Пра канвергентныя рэдакцыі

**Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, намеснік міністра інфармацыі:**

— Гэта ўжо другая сустрэча за апошні час у Бабруйску. Нядаўна тут прайшоў семінар на сугучную тэму аб інфармацыйным забеспячэнні сацыяльна-эканамічнага развіцця Магілёўскай вобласці і задачах сродкаў масавай інфармацыі. Сёння ў краіне выходзіць болей за 1600 друкаваных СМІ. Мы запрасілі сюды не толькі прадстаўнікоў папяровых выданняў. Гэта свайго роду агляд масавых сродкаў інфармацыі, пошук новых тэхналагічных шляхоў, наладжванне стасункаў. Трэба ствараць пляцоўку для агульнай размовы, аналізаваць лепшы вопыт, дзяліцца ім з тымі рэдакцыямі, якія знаходзяцца ў сілу розных прычын у горшых умовах.

Кантэнтавы матэрыял павінен быць розны, як на радыё, так і ў газетах. Калі казаць пра папяровы друк, то ў нас не хапае аналітыкаў, экспертаў высокага ўзроўню. У рэдакцыі газет павінны прыйсці спецыялісты высокага класу. У інтэрнэце мы чытаем тэкст 30—50 секунд, калі ён адымае ў нас 3-5 хвілін, мы яго ўжо не ўспрымаем. Тое, што будзе займаць 20—30 хвілін, у інтэрнэце наогул не чытаецца. Іншая справа — газета.

**Святлана ШУТАВА, галоўны рэдактар інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведамасці»:**

— Зразумела, што ў свеце новых тэхналогій, інтэрнэту абласная або раённая газета ў сваім класічным разуменні ўжо не ўспрымаецца. У Бабруйску акцэнт зрабілі на радыё і тэлебачанне. Мы развіваем выдавецкую дзейнасць, робім сацыялагічныя даследаванні і з'яўляемся філіялам Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Куляшова па падрыхтоўцы будучых журналістаў. У Шклове раённая газета «Ударны фронт» стварыла сваё тэлебачанне. У Клімавічах таксама развіваюць тэлевізійны варыянт. Бялыніцкая газета «Зара над Друццю» адкрыла прэс-цэнтр, куды не толькі запрашаюць гасцей, але і робяць выязныя рэпартажы з выканкамам. І ў Шклове, і ў Бялынічах на высокім узроўні аказваюць паліграфічныя паслугі. Усё гэта той вопыт, які трэба вывучаць і аналізаваць.

**Вадзім ШЧАГЛОЎ, галоўны рэдактар газеты «Бабруйскае жыццё»:**



— Я не ўяўляю сабе работу сённяшніх друкаваных СМІ без відэакантэнту. У кожнай рэдакцыі ёсць фатограф, чаму ён, акрамя фота, не можа зняць 40 секунд відэа? Сёння ў журналістыцы ёсць попыт на людзей, якія могуць працаваць у сацыяльных сетках і ўмеюць карыстацца відэакамерай. Відэа ў сацыяльных сетках зробіць больш, чым артыкул на паласе ў газеце.

## Пра крытыку

**Аляксандр МАРКАЧОЎ, намеснік старшыні Бабруйскага гарвыканкама:**

— Неабходна шукаць кансэнсус паміж уладамі і СМІ. Трэба, каб былі крытычныя матэрыялы, актуальныя для жыццядзейнасці горада і цікавыя для насельніцтва. І ў той жа час, каб гэта крытыка не біла цераз край. Стрымліванне павінна быць не для таго, каб не даць сказаць, а для таго, каб не нарабіць памылак. Важна, каб быў кантакт паміж мясцовым кіраўніцтвам і галоўным рэдактарам.

**Павел СУХАРУКАЎ, дырэктар — галоўны рэдактар «Выдавецкага дома «Звязда»:**

— Мне не падабаецца назва «крытычныя матэрыялы», ён абмяжоўвае ў манеўры. Я назваў бы «праблемны матэрыял». Ніхто не забараняе нам пісаць праблемныя артыкулы. Але гэта не павінна быць па-вярхоўна, трэба дадаць пункты гледжання розных бакоў. Упэўнены, калі матэрыял прафесійны, ніколі не будзе праблем з уладай. Мы, журналісты, павінны выразна ўяўляць сабе мэты і задачы. Ад матывацыі залежыць змест.

**Валянціна РАЖАНЕЦ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:**

— Па сутнасці, улада і СМІ выконваюць адну і тую ж дзяржаўную задачу. Таму павінна быць і разуменне, і ўзаемадзеянне. Агульнага рэцэпта паспяховасці немагчыма знайсці, але імкнуцца да гэтага трэба. І на сённяшнім прыкладзе мы ўпэўніліся, што поспех будзе там, дзе грамадства, улада, журналісты, розныя іншыя структуры аб'яднаны адной ідэяй, адным праектам. Ёсць шмат прыкладаў канструктыўнай крытыкі ў сродках масавай інфармацыі з паказам таго, як разам справіліся з праблемай. Не менш важна выхаваць у чытача імкненне да стваральнай дзейнасці. Вельмі цяжка ставіць на вагі эканоміку і тыраж, густ чытача і задачы дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі. Тут усё павінна быць збалансавана. А да журналісцкага майстэрства трэба мець яшчэ і інтуіцыю, каб быць на крок наперадзе ў вызначэнні актуальнай і цікавай тэмы.

**Аляксандр ЛАГВІНОВІЧ, галоўны рэдактар брэсцкай абласной газеты «Заря»:**

— Ёсць сацыялагічныя даныя наконт таго, якім сродкам масавай інфармацыі чытач даверае больш. І на першым месцы ідуць менавіта друкаваныя сродкі інфармацыі. Гэта як шкілет, на якім нарошчваюць вагу і ствараюць СМІ новага пакалення. Што датычыцца крытычных, або так званых праблемных публікацый, то, мне здаецца, што мы дзесьці штучна сябе лімчуем. Мауляў, нашы крытычныя публікацыі менеш крытычныя, чым у прыватных выданнях. Пад свабодай слова нам імкнуцца навязаць нешта такое, што гэтым не з'яўляецца. Паспрабуйце сёння ў Еўропе заікнуцца пра тое, што парад геяў перашкаджае руху транспарту. Або пра смяротнае пакаранне. Нас спрабуюць правакаваць у інтэрнэце нашы апаненты. Маўляў, вы не напішаце. У журналістыцы трэба яшчэ сто разоў падумаць, што і як пісаць. Хацелася б закрануць яшчэ адну балючую тэму. У інтэрнэце стала шмат прадпрымальнікаў, якія, не з'яўляючыся журналістамі, займаюцца журналістыкай. Яны адкрываюць інфармацыйныя парталы і робяць кампіляцыю чужых матэрыялаў. Пры гэтым спрабуюць фарміраваць грамадскую думку, і часам паспяхова. Нават для таго, каб адкрыць газету-дайджэст, сёння трэба атрымаць ліцэнзію. А для інтэрнэта нічога падобнага не патрэбна. І гэта таксама нельга ігнараваць.

## Пра падтрымку

**Ніна ПАЗНЯК, галоўны рэдактар Лідскага тэлерадыёаб'яднання:**

— Нашай тэлерадыёкампаніі 12 гадоў. Усё пачыналі з нуля. За свае грошы пабудавалі эфірнае тэлебачанне, дзве FM-станцыі. Калектыў прафесійны, не раз адзначаны на шматлікіх конкурсах, у тым ліку і міжнародных. У нас 9 «Тэлевяршыняў», усе сцены ў граматах. Мы зрабілі ўсё, што можна было зрабіць рэгіянальшчыку. У нас тысячы падпісчыкаў, але існаваць у сучаснай эканамічнай сітуацыі без падтрымкі цяжка.

**Святлана ШУТАВА:**

— Вельмі важна, калі існуе паразуменне з сузаснавальнікам, — гэта 50—70% поспеху, калі цябе падтрымліваюць. У Бабруйску, Шклове ёсць падтрымка. Але гэта не ўсюды так.

* * *

*Падчас круглага стала таксама закраналіся тэмы кадравага забеспячэння, зносін дзяржаўных органаў улады са сродкамі масавай інфармацыі, іншыя, не менш актуальныя, пытанні.*

*— Гэтыя сустрэчы трэба працягваць, — падвёў вынікі круглага стала Аляксандр Карлюкевіч. — Было б цікава завітаць у Ліду і агучыць тыя пытанні, якія датычацца непасрэдна электронных сродкаў масавай інфармацыі. Наогул тэм для абмеркавання шмат. Я спадзяюся, што шэраг іх будзе потым разгледжаны ў якасці падставы для заканадаўчай ініцыятывы.*

**Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.** zigulya@zviazda.by

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ

# ЧАМУ СПІЛАВАЛІ ЛІПЫ?



**У рэдакцыю звярнулася жыхарка Мінска Ірына Вароніна. У сваім лісце яна расказала, што для будаўніцтва жылога 10-павярховага дома па вуліцы Уфімскай выезд з аб'екта рабочых машын зрабілі праз зялёную зону каля дома №20 па вуліцы Магілёўскай. Акрамя таго, падчас падрыхтоўкі да будаўніцтва пачалі пілаваць старыя ліпы ў раёне вул. Талстога. Па словах Ірыны Анатолеўны, гэтыя дрэвы засталіся амаль адзінай зялёнай тэрыторыяй для мясцовых жыхароў. «Ліпы дасталіся нам у спадчыну ад вуліцы Талстога, калі пад знос ішлі старыя дамы. Ліпы старыя, але вельмі прыгожыя. Гэта адзіны аазіс для жыхароў нашых дамоў, бо пад нож пусцілі дрэвы па вуліцы Жукоўскага ў сувязі з будаўніцтвам метро», — напісала спадарыня Вароніна.**

Як паведамілі ў камітэце архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама, у раёне вуліц Магілёўскай, Уфімскай прадугледжана будаўніцтва аднасекцыйнага 10-павярховага жылога дома з падземнай гараж-стаянкай на 44 машына-месцы і паркоўкай на 17 машына-месцаў на месцы знасімых будынкаў былога ваенкамата. Таксама запраектаваны дзіцячая пляцоўка, пляцоўка адпачынку, азеляненне і размяшчэнне малых архітэктурных формаў.

— Згодна з п. 9.2.1 ТКП 45-3.01-116-2008, удзельная вага азелянення тэрыторый у межах тэрыторыі жылой і змяшанай забудовы павінна складаць не менш за 25%. У межах работ на аб'екце ўзровень азелянення складае 35,18%, што значна перавышае нарматыў, — расказаў **дырэктар ТАА «Тапас» Сяргей СТАВЕР.** — Колькасць зялёных насаджэнняў, якія высякаюцца пры будаўніцтве аб'екта, і колькасць кампенсацыйных пасадак і выплат узгоднены з УП «Зеленбуд Кастрычніцкага раёна г. Мінска». Арганізацыя руху транспарту на перыяд будаўніцтва ўзгоднена з УДАІ г. Мінска і ЗАТ «ТПС-Цэнтр».

Па інфармацыі камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама, таксацыйным планам прадугледжана высечка 46 і захаванне 13 дрэў. Кампенсацыйныя пасадкі склалі 96 дрэў і 6 кустоў.

— Таксама адзначаем, што будаўніцтва дома вядзецца на месцы пустога і састарэлага адміністрацыйнага будынка, знос якога адбыўся за кошт забудоўшчыка. У кампаніі ўпэўнены, што горад павінен працягваць сваё арганічнае развіццё, а на змену старым забытым будынкам — прыходзіць сучасныя аб'екты. Дарэчы, аўтарскі архітэктурны праект аб'екта дазволіць яму гарманічна ўпісацца ў існуючую забудову і павысіць агульную прэзентабельнасць квартала, які знаходзіцца ў цэнтральнай частцы сталіцы. Не варта забываць і пра тое, што будаўніцтва любога жылога дома нясе ў сабе ў тым ліку сацыяльную функцыю. Мы выдатна разумеем пазіцыю некаторых мясцовых жыхароў, якія звыкліся з цяперашнім ландшафтам і працівяцца любым зменам, аднак гарманічнае развіццё нашай сталіцы не можа ісці адпаведна з пажаданнямі асобных грамадзян. Для цэнтральнай часткі сталіцы гэты момант асабліва актуальны, — адзначылі ў ТАА «Тапас».

У адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб раслінным свеце» выдаленне, перасаджванне аб'ектаў расліннага свету дапускаюцца ў выпадку будаўніцтва, калі зацверджанай ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку праектнай дакументацыяй прадугледжваюцца выдаленне, перасадка аб'ектаў раслiннага свету.

# АДХОДАМ ДАДУЦЬ ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Напрыклад, у Іспаніі і Партугаліі гэтая велічыня супадае з беларускай. Не так далёка знаходзяцца Фінляндыя і Францыя.

— Што ўваходзіць у гэты аб'ём перапрацоўкі? — аналізуе сітуацыю **начальнік упраўлення па каардынацыі дзейнасці ў сферы абыходжання з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Анатоль ШАГУН.** — Напрыклад, мы далі другое жыццё больш чым 300 тысячам тон паперы. Калі б мы гэтага не зрабілі, то давялося б высекчы лесу аб'ёмам да 950 футбольных палёў. Больш за 168 тысяч тон шкла занялі б каля 4200 чыгуначных вагонаў, якія можна было б паставіць у цягнік, што па даўжыні расцягнуўся б на ўсю МКАД. А яшчэ ўлічыце 67,3 тысячы тон пластыку! Таксама мы сабралі 4,9 тысячы тон адпрацаваных маслаў, 2,3 тысячы тон бытавой тэхнікі і амаль 21 тысячу тон шын. Канешне, з пункту гледжання агульных аб'ёмаў збору гэтыя лічбы пакуль далёкія ад ідэальных, але ёсць да чаго імкнуцца.

## На смецці зарабляецца валюта

Дзякуючы выкананню Нацыянальнай стратэгіі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі ў Беларусі на перыяд да 2035 года нам ужо няма патрэбы закупляць у ранейшых аб'ёмах тую ж макулатуру і шкло за мяжой. Калі яшчэ ў 2011 годзе сальда гандлю другаснай сыравінай было адмоўным і перавышала 17 мільёнаў долараў, то ўжо летась мы экспартавалі больш на $6,8 млн.

— Аднак перапрацоўка ў якасці другаснай сыравіны — гэта, бадай што, адзіны спосаб выкарыстання ў Беларусі адходаў, — кажа Анатоль Шагун. — І пры гэтым зусім не задзейнічаны іншыя метады. Між іншым, у многіх развітых краінах Захаду ад пахавання смецця ўсё часцей адмаўляюцца. Гэта дзякуючы таму, што арганіку там выкарыстоўваюць як сыравіну для прыгатавання паліва і атрымання біягазу. Для апошняга патрэбны спецыяльныя заводы.

У Беларусі гэтых тэхналогій пакуль няма, але ў планах будаўніцтва ўжо значыцца спецыяльны завод для спальвання смецця. Пляцоўка для яго ўзвядзення абрана ў Мінску. Гэты выбар абумоўлены некалькімі фактарамі. Па-першае, у горадзе і прысталічным раёне вельмі вялікая шчыльнасць насельніцтва. А па-другое, з-за гэтага магчымасці для пахавання адходаў вельмі абмежаваныя. Еўрапейскі вопыт паказвае, што спальванне адходаў дазваляе зменшыць іх колькасць ажно на 90%! Пры гэтым яшчэ будзе выпрацавана цеплавая і электрычная энергія. Адным словам, плюсы відавочныя. А мінусы?

— На жаль, у Беларусі вопыту такога будаўніцтва няма, — працягвае Анатоль Шагун. — Ды і выдаткі на праектаванне, узвядзенне і запуск прадпрыемства, якое зможа перапрацоўваць 500—600 тысяч тон смецця, складуць каля 200 мільёнаў еўра. Гэта велізарная сума. На маю думку, найбольш прымальны спосаб атрымання такой велічыні сродкаў — гэта арганізацыя інвестыцыйнага конкурсу. Трэба, каб да нас прыйшлі кампаніі, якія ўжо валодаюць неабходнымі тэхналогіямі, будавалі і эксплуатавалі раней падобныя заводы. А на якіх умовах завод у Мінску можа функцыянаваць — гэта ўжо вынік перамоў паміж уладамі горада і патэнцыйным інвестарам.

## Як у СССР. І нават лепш

Па прыклады добра наладжанай сістэмы па зборы шклатары далёка хадзіць не трэба. Напрыклад, у савецкія часы паўлітровая бутэлька малака каштавала 28 капеек. Прычым у гэтую суму быў закладзены залогавы кошт тары ў выглядзе 15 капеек. Натуральна, што ў насельніцтва быў добры стымул вярнуць гэтыя грошы — не пераплочваць жа амаль удвая на роўным месцы!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Падобная сістэма захавалася і ў Еўрасаюзе, — кажа Анатоль Шагун. — Але яна пайшла значна наперад у параўнанні з савецкімі часамі. Напрыклад, у нас па тагачаснай методыцы збіралася толькі шклатара. Поліэтыленавай тары тады не было, а алюмініевую ўпакоўку проста не перапрацоўвалі. Цяпер жа праблем з гэтым няма. Мяркуецца, што дэпазітная сістэма запрацуе ў 2020 годзе. Па разліках аўтараў Нацыянальнай стратэгіі, гэта дазволіць яшчэ на 10% павялічыць перапрацоўку адходаў другаснай сыравіны.

## Ці рэальна заварыць усе смеццеправоды?

Яшчэ ў 2015 годзе было агучана рашэнне ўрада аб арганізацыі паэтапнай кансервацыі смеццеправодаў у беларускіх шматпавярховых дамах. З аднаго боку, гэта дапаможа раздзельнаму збору адходаў — замест аднаго кантэйнера для ўсяго з'яўляюцца асобныя ёмістасці для паперы, шклабою, металу, пластыку... Аднак ці ўсюды гэта магчыма зрабіць?

Напрыклад, аўтар гэтых радкоў жыве ў класічнай савецкай панельнай дзевяціпавярхоўцы. У кожным пад'ездзе дома — 54 кватэры. Амаль цэлая «хрушчоўка» па памерах! А пад'ездаў гэтых ажно дзевяць. Іншыя дамы ў маім квартале — такога ж тыпу «кітайскіх сцен». Да таго ж існуюць нормы, паводле якіх пляцоўку са смеццевымі кантэйнерамі нельга размяшчаць бліжэй чым за 20 метраў ад жылога дома, а для смеццявозаў павінны мецца добрыя пад'язныя шляхі. Праўда, апошнімі двары з тупіковымі праездамі пахваліцца часта не могуць. І вось дзе знайсці тэрыторыю для добрай колькасці кантэйнераў — замест кавалка зялёнай зоны ці адабраць у аўтамабілістаў некалькі і так дэфіцытных парковачных месцаў? Пытанне дыскусійнае. Да таго ж трэба ўлічыць і фактар зручнасці. Несці пакеты са смеццем кудысьці за 100—200 метраў хочацца далёка не заўсёды. Асабліва ў дождж, моцны вецер, снег, галалёд. А дадайце сюды яшчэ і стары зношаны ліфт, які размяняў ужо пяты дзясятак гадоў і часта ламаецца. Хадзіць лішні раз восем паверхаў уверх і ўніз толькі для таго, каб выкінуць смецце, задавальнення таксама мала. І для параўнання — цяперашняя сістэма, калі дастаткова выйсці на лесвічную пляцоўку пад'езда, дзе знаходзіцца шлюз смеццепravoда.

— Тыя архітэктурныя рашэнні, якія рэалізоўваліся 20—40 гадоў таму, былі для свайго часу добрыя, — разважае Анатоль Шагун. — Але менавіта планіроўка старых дваровых тэрыторый стварае зараз істотныя праблемы для паўнавартаснага заварвання смеццеправодаў. Кантэйнеры не заўжды можна паставіць так, каб і жыхарам было зручна, і санітарныя нормы выконваліся.

Выйсце было знойдзена ў выглядзе падземных кантэйнераў. Вопыт іх эксплуатацыі ўжо ёсць у Брэсце, Мінску і Магілёве. Цяпер жа ў Магілёве стартуе масавы пілотны праект. Там установяць 70 падземных ёмістасцяў для змяшанага збору адходаў. Калі сістэма прыжывецца, яе і запусцяць у серыю па ўсёй краіне.

## Тэхніка дапаможа

— Зараз сістэма абыходжання з адходамі ў Беларусі патрабуе каля 200 мільёнаў рублёў на год, — падлічвае Анатоль Шагун. — Грошы выдаткоўваюцца непасрэдна на збор адходаў, іх вываз, сартаванне і пахаванне. На 90% іх кампенсуюць спажыўцы — фізічныя і юрыдычныя асобы. На долю бюджэтнага субсідавання прыходзіцца дзясятая частка. Зрэшты, па краіне сітуацыя нераўнамерная. Напрыклад, у гэтай галіне Мінску ўдалося сысці цалкам ад датацый. А вось у сельскіх населеных пунктах бюджэт фінансуе немалы працэнт выдаткаў на адходы. Не ў апошнюю чаргу з-за таго, што аб'ёмы смецця, якое вывозіцца, малыя.

Нацыянальная стратэгія прадугледжвае, што да 2035 года гэтая сума скароціцца прыкладна на 20%. Дасягнуць гэтага па разліках дапаможа сучасная тэхніка (у тым ліку больш умяшчальныя смеццявозы), кантэйнеры з павялічаным аб'ёмам і больш высокі ўзровень прэсоўкі адходаў.

Агулам жа да 2035 года ў Беларусі плануецца перапрацоўваць палову ўсіх адходаў. Ужо цяпер гэты паказчык дасягнуты ў Германіі, Швейцарыі і Швецыі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

КАМУНАЛЬНЫЯ СТАСУНКІ

# «СМЕЦЦЕВАЯ» СТРАТЭГІЯ

## У Беларусь вернецца залог за тару і з'явіцца новая класіфікацыя адходаў

**Утылізацыя і захаванне цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) у Мінску маюць праблемны характар. Існуючыя палігоны перакрылі ўжо ўсе магчымыя і немагчымыя нарматывы. Пра гэта на пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі і Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання заявіў нядаўна Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.**

Апошнія 10 гадоў на аб'ектах захавання адходаў наводзяць парадак і скарачаюць іх колькасць. На мэце зменшыць яе да 130, што аптымальна для Беларусі. Аднак гэта павінны быць высокатэхналагічныя аб'екты, якія будуць адпавядаць усім патрабаванням экалагічнай бяспекі, заўважыў **Аляксандр ЦЕРАХАЎ, міністр камунальнай гаспадаркі Беларусі,** расказваючы пра нацыянальную стратэгію па абыходжанні з ЦКА і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі ў Беларусі да 2035 года.

— Стратэгія складаецца з некалькіх модуляў, кожны з якіх скіраваны на стымуляванне выкарыстання другасных рэсурсаў і дасягненне яго ў 2035-м да ўзроўню 50%. Базавы модуль — гэта ўдасканаленне сістэмы ўліку, лагістыка, заканадаўства, сістэма кіравання і ўдасканаленне інфраструктуры.

Камунальнікі плануюць выкарыстоўваць цвёрдыя адходы ў вытворчасці энергіі, у прыватнасці на сарціровачных заводах у Гродне і Магілёве. Паралельна з гэтым жыллёвая служба займаецца праблемай выкарыстання цвёрдых адходаў на камунальных кацельных.

— Ужо распрацаваны эксперыментальны кацёл, і ў наступным годзе, напэўна, будзе збудавана першая кацельная, якая запрацуе з выкарыстаннем ЦКА, — паведаміў міністр ЖКГ.

Акрамя таго, плануецца ўвесці дэпазітную залогавую сістэму.

— Гэта ўспамін з савецкага мінулага, калі тару з-пад напою здавалі ў краму, бо атрымлівалі за яе ўзнагароджанне. Але сучасная сістэма будзе працаваць з выкарыстаннем новых тэхналогій, — дадаў ён.

Міністр таксама звярнуў увагу, што праблема захавання адходаў найбольш актуальная для сталіцы, улічваючы колькасць яе жыхароў, і запэўніў, што Мінску не ўдасца абысціся без стварэння завода для спальвання смецця. Гэтая прапанова таксама ўнесена ў нацыянальную стратэгію па абыходжанні з адходамі.

**Ія МАЛКІНА, выконваючая абавязкі міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі,** расказала, што Мінпрыроды сумесна з ЖКГ працуе над удасканаленнем работы з адходамі, і падзялілася планамі комплекснай карэкціроўкі дзейных нормаў у галіне абыходжання з камунальнымі адходамі і другаснымі рэсурсамі.

— Плануем маштабную перапрацоўку закона аб абыходжанні з адходамі з магчымым выхадам на кадыфікацыю заканадаўства ў гэтай сферы. Кардынальна мяняем тэрміналогію, якая выкарыстоўваецца ў заканадаўстве аб абыходжанні з адходамі. Распрацоўваем новы класіфікатар камунальных адходаў, суадносім класіфікацыю адходаў, якія ствараюцца ў Беларусі, з еўрапейскім класіфікатарам.

Яна паведаміла, што Мінпрыроды будзе прапаноўваць забараняць захаванне адходаў, якія не прайшлі першасную апрацоўку. А таксама ўводзіць адзіныя патрабаванні і правілы для суб'ектаў усіх формаў уласнасці, якія працуюць у галіне абыходжання з ЦКА.

Аптымальны варыянт для ўтылізацыі адходаў і іх перапрацоўкі, у тым ліку і тып завода для спальвання смецця, павінны выбіраць спецыялісты, дадала яна.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

НОУ-ХАЎ

# АД ПРЫДАМАВЫХ ДА ПАДЗЕМНЫХ

## У Магілёве рэалізуецца пілотны праект з усталяваннем заглыбленых кантэйнераў

**У пошуках больш эфектыўнага рашэння праблемы збору бытавых адходаў камунальнікі за апошнія некалькі гадоў здзейснілі сапраўдны рывок. На змену звычайным кантэйнерам спачатку прыйшлі паасобныя, а цяпер ёмістасці наогул «схавалі» пад зямлёй.**

Для Магілёўскай вобласці заглыбленыя кантэйнеры не навінка. Чатыры гады таму першыя з іх ужо былі апрабаваны ў Магілёве. Яны паявіліся там, дзе па санітарных нормах нельга было зрабіць (адмысловую пляцоўку ад вокнаў жылога дома да месца знаходжання ёмістасцяў для збору цвёрдых бытавых адходаў павінна быць не менш за 20 метраў). Цяпер у краіне праводзіцца работа па закрыцці ўнутрыдамавых смеццеправодаў, і магілёўскія камунальнікі ініцыявалі ўстаноўку заглыбленых кантэйнераў як альтэрнатыву.

— Мы зрабілі тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне з прыкладамі таго, што гэта зручна і выгадна, і на працягу года даказалі гэтыя перавагі, — паведаміў **дырэктар Магілёўскага Спецаўтапрадпрыемства Анатоль ТАЛПЫГА.** — У Магілёў прыязджалі камісіі, вывучалі абставіны на месцы і нарэшце далі дабро. Па лініі «Аператара другасных рэсурсаў» нам выдзяляюць 175 тысяч рублёў на ўкараненне праекта.

Заглыблены кантэйнер мае аб'ём 5 метраў кубічных і фактычна замяняе



сем стандартных па 0,75 кубоў. На паверсе знаходзіцца толькі цыліндр дыяметрам каля 2 метраў і герметычная накрыўка. Навінкі яшчэ і ў тым, што ўнутры ёмістасці знаходзіцца сістэма пажаратушэння. Калі туды трапляе запаленая цыгарэта, механізм спрацоўвае і засыпае месца ўзгарання парашком.

— Заглыбленыя кантэйнеры — вельмі добры варыянт збору адходаў, — упэўнены дырэктар Спецаўтапрадпрыемства. — Гэта і чысціня, і культура, і павелічэнне аб'ёму вымання другасных матэрыяльных рэсурсаў. Ні бадзяжныя сабакі туды не дабяруцца, ні птушкі, ні людзі без пэўнага месца жыхарства. Можна без канца пералічваць перавагі, якія дасць аснашчэнне жыллёвага сектара такімі кантэйнерамі. І побач ніякага смецця не валяецца. Было б добра зусім адмовіцца ад звычайных смеццевых пляцовак, а замест іх паставіць заглыбленыя кантэйнеры. Людзі, на жаль, не заўсёды разумеюць перавагі новаўвядзення, бо ім працей было б выкідваць смецце не выходзячы з дому. Але новыя кантэйнеры — большая гарантыя таго, што на лесвічных пляцоўках будзе чыста і без непрыемных пахаў.

Ужо складзены і зацверджаны Магілёўскім гарвыканкамам графік, згодна з якім да 1 студзеня наступнага года ўсе 70 кантэйнераў будуць устаноўлены. Акрамя гэтага, Спецаўтапрадпрыемства набывае другую машыну, якая будзе вывозіць з гэтых кантэйнераў цвёрдыя бытавыя адходы. Машына абсталявана адмысловым прыстасаваннем — кранам-маніпулятарам (КМУ), што дазваляе даставаць змесціва кантэйнера без асаблівых праблем.

Хутчэй за ўсё праект будзе распаўсюджаны на іншыя вобласці. Але, як кажа Анатоль Талпыга, тых 70 кантэйнераў, якія ўсталююць у Магілёве, для горада недастаткова. Трэба яшчэ 100, каб закрыць усе смеццеправоды.

Дарэчы, некалькі гадоў таму заглыбленыя кантэйнеры з'явіліся і ў Горках. Па словах горацкіх камунальнікаў, на іх абслугоўванні знаходзіўся двор, дзе нельга было зрабіць пляцоўку для збору смецця, жыхары выкідвалі пакеты з бытавымі адходамі на вуліцы. А калі ў двары з'явіўся заглыблены кантэйнер, праблема вырашылася сама сабой.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

ЗАМЕЖНЫ ВОПЫТ

# «ЗЯЛЁНЫЯ» ПРАВІЛЫ

## Турысты з Беларусі расказалі, як жыхары іншых краін спраўляюцца з праблемай адходаў

**Нагадаем, конкурс аматарскіх рэпартажаў стартаваў 15 чэрвеня па ініцыятыве «Аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў». Яго мэта — прыцягнуць падарожнікаў да праблемы адходаў і сабраць як мага больш інфармацыі пра «зялёныя» звычкі і правілы замежнікаў. Мы дзелімся некаторымі цікавымі назіраннямі з розных краін свету першых канкурсантаў.**

**Рым (Італія).**
**Ігар Пашчанка:**

— Мясцовыя жыхары з дзяцінства прывучаны сартаваць смецце. На кожнай вуліцы стаяць асобныя скрыні: для харчовых адходаў, шкла, пластыку і паперы, як і ў нас. Вельмі шмат адходаў утвараецца пасля паходу ў краму. Кожны тавар тут пакуюць у пластыкавы латок і закручваюць у цэлафан. Браць садавіну голымі рукамі забаронена. Для гэтых мэт трэба абавязкова надзяваць аднаразовую пальчатку, якая пасля выкарыстання адразу ж адпраўляецца ў смецце. Большасць адходаў — гэта пластыкавыя бутэлькі ад вады, якую п'юць шмат з-за спякоты, і рэкламныя лісты.

Італьянцы заўсёды прыбіраюць за хатнімі жывёламі і за сабой пасля пікніка. У выпадку парушэнняў могуць узнікнуць непрыемнасці. Аднак з утылізацыяй адходаў у Рыме вялікія праблемы. У некаторых раёнах смецце не вывозяць па шэсць дзён, што прымушае мясцовых жыхароў скандаліць з начальствам і запрашаць журналістаў. Часам на вуліцах можна сустрэць маладых цемнаскурых людзей, якія падмятаюць вуліцы, за што мясцовыя кідаюць ім манеткі. Але сапраўдная катастрофа — за горадам. Здаецца, што там смецце не вывозяць наогул!

**Краснадарскі край (Расія).**
**Таццяна Пераверзева:**

— Калі ёсць на свеце рай, то гэта Краснадарскі край. Я аб'ездзіла практычна ўсё чарнаморскае ўзбярэжжа Краснадарскага краю: Джугбу, Геленджык, Анапу, Туапсэ... І ўсюды, дзе б я ні была, нават у непрызнанай Рэспубліцы Абхазія, чыста і акуратна. Вуліцы Адлера прыбіраюць кожную раніцу. Прычым выкарыстоўваюць як венікі, так і спецыяльныя прыборы накшталт пыласоса. Што датычыцца паасобнага збору смецця, то спецыяльныя кантэйнеры, да майго здзіўлення, бачыла толькі на вакзале і ў аэрапорце. Аднак мясцовых жыхароў гэта не спыняе, яны прывозяць смецце і туды. Засмучае толькі, што ягоўсё роўна забіраюць разам са змяшаным. Атрымліваецца, рознакаляровыя кантэйнеры стаяць толькі для галачкі? Затое «безымянных» скрыні тут на кожным кроку.



**Берлін (Германія).**
**Алена Валкоўская:**

— Германія — краіна, дзе кожны чалавек плаціць за адходы, якія ўтварае. За вываз смецця ў год выходзіць каля 165 еўра, а за няправільны збор адходаў лічба будзе нашмат вышэйшай. Таму сартаванне смецця для немцаў — натуральная справа.

Акрамя стандартных чатырох кантэйнераў, у Германіі ўстаноўлены яшчэ для харчовых і электронных адходаў. Старыя рэчы можна аднесці ў светла-жоўты бак Чырвонага Крыжа. Ён усталёўваецца адзін на тры вуліцы. Пры гэтым абутак трэба класці толькі па парах, а вопратку папярэдне мыць і пакаваць у мяшкі. Астатняе смецце можна даставіць у рэцыклінгавыя канторы. Напрыклад, туды можна адвезці канапу ці нейкія хімічныя адходы.

«Нават самы звычайны выкарыстаны пакецік ад гарбаты проста так не выкінуць: сам пакецік трэба адправіць у «харчовыя адходы», а паперку з заклёпкамі — у «лёгкія ўпакоўкі», — расказала мясцовая жыхарка Алена. — Пляцоўка для смеццевых кантэйнераў каля кожнага дома свая. Яна замыкаецца на ключ, каб нядобрасумленныя жыхары з суседніх дамоў не змаглі ёй скарыстацца, паколькі вываз смецця ў Германіі даволі дарагі. Адходы з бакаў забіраюць штотыдзень, для кожнага віду прыязджае асобная машына».

Па словах Алены, у нямецкіх крамах сталі актыўна адмаўляцца ад пластыкавых пакетаў, прапаноўваючы набыць папяровыя, тканкавыя або нейлонавыя сумкі.

**Кацярына КІРЭЕВА.**
*katyakireeva@zviazda.by*

***Дасылайце свае «зялёныя» гісторыі з адпачынку да 30 верасня і атрымлівайце цікавыя сувеніры. Аўтараў найлепшых рэпартажаў «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» узнагародзіць планшэтамі і mp3-плэерамі. Падрабязна пра конкурс, форму заяўкі і правілы для рэпартажаў глядзіце на сайце руху «Цэль 99» http://target99.by/.***

МЕРКАВАННІ

# Як вы ўтылізуеце адходы?

## Такое пытанне мы адрасавалі жыхарам нашай краіны

**Кіраўнік праекта Цэнтра экалагічных рашэнняў «Зялёная карта» Марыя СУМА:**

— Адходы бываюць розныя. Паперу я адношу ў спецыяльныя кантэйнеры, пластык таксама выкідваю ў кантэйнеры, якія размешчаны недалёка ад нашага офіса. Туды ж адпраўляюцца металалом і шкло. Батарэек у мяне практычна няма, але калі яны з'яўляюцца, то іх я адношу ў пункты прыёму БелВТІ. Для буйнагабарытных электронных адходаў таксама выклікаю службу, якая вывозіць падобныя рэчы. Лекі збіраю дома, нікуды не выкідваю. Арганічныя адходы, на жаль, выкідваю ў агульны кантэйнер. Чаму на жаль? Таму што ў нас у горадзе няма сістэмы паасобнага збору падобных адходаў. Вопратку адношу ў дабрачынны праект «KaliLaska». Я ўвогуле лічу, што трэба не толькі ўтылізаваць адходы, але і прадухіляць іх утварэнне. Гэта значыць, купляць тое, што можна шматразова выкарыстаць. Чаму неабходная ўтылізацыя? Трэба разумець, што многія адходы можна перапрацаваць і атрымаць рэсурсы. Звалка — гэта не абавязкова канчатковы вынік прадукту.

**Спецыяліст па тэставанні кампаніі Neklo Станіслаў ГАРАХАВІК:**

— Не магу сказаць, што я актывіст у гэтым пытанні. Я стараюся выкідваць пластык у спецыяльны кантэйнер, які стаіць каля майго дома. Што датычыцца батарэек, то для іх у мяне на рабоце таксама ўстаноўлены кантэйнер. У цэлым, гэта ўсе мае намаганні. Але я б хацеў утылізаваць адходы паасобна, каб былі створаны неабходныя ўмовы. Напрыклад, калісьці арганізацыя, у якой я працую, захацела асобна выкідваць пластыкавы посуд. Справа ў тым, што мы штодня заказваем шмат абедаў, адпаведна, посуд трэба неяк перапрацаваць. Але нічога не выйшла: калі канкрэтна ў нашым офісе мы дамовіліся ўтылізаваць адходы раздзельна, то кіраўніцтва офіснага будынка ў цэлым не пайшло нам насустрач. Мне здаецца, гэта сапраўды важнае пытанне, таму хацелася б, каб пра гэты аспект гаварылі часцей.

**Прадавец у прадуктовай краме Кацярына ШАЛКЕВІЧ:**

— Дома мы з бацькамі сартуем усе адходы паасобку. Асобна збіраем пластык — гэта часцей за ўсё ёмістасці ад касметыкі, а таксама ўсякія ачышчальныя сродкі. Тэтрапакі мы выкідваем у сметнік для харчовых адходаў. У нас ёсць асобны сметнік для шкла. У сваім пакоі я асобна збіраю паперу, побач з прынтарам у мяне стаіць спецыяльная скрынка. Калісьці мой тата паглядзеў перадачу пра тое, як перапрацоўваюцца адходы, быў уражаны — і ўжо тры гады мы збіраем іх асобна. Часам бачу, што людзі ў кантэйнер для пластыку, шкла выкідваюць харчовыя адходы. І становіцца крыўдна, што яны так могуць рабіць. Каб зрабіць навакольнае асяроддзе хоць трохі чысцейшым, трэба пачынаць з сябе. Вельмі добра, што ў нашым двары ёсць кантэйнеры для асобнага збору смецця. І па дарозе на работу вельмі зручна выкідваць у гэтыя бакі пластык і шкло.

**Студэнтка Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Арына КЛІМОВІЧ:**

— Я асобна збіраю пластык, хоць спецыяльны кантэйнер знаходзіцца, мякка кажучы, далёка ад майго дома. Часам аддаю пластык бацькам, таму што да іх кантэйнеры знаходзяцца значна бліжэй. Таксама кардон і паперу я выкідваю ў кантэйнер, на якім напісана «Макулатура». Усё астатняе адпраўляю ў звычайную сметніцу. Чаму я пачала гэтым займацца? У нас у сям'і так прынята ўжо некалькі гадоў, з таго часу, як з'явіліся асобныя кантэйнеры. Што датычыцца макулатуры, то звычка збіраць яе асобна засталася яшчэ са школьных часоў. Дарэчы, цікавы момант: асобна я збіраю пластыкавыя накрыўкі ад бутэлек, таму што яны з'яўляюцца іншым відам пластмасы і перапрацоўваюцца асобна. У нас ёсць сябры сям'і, якія перадаюць гэтыя накрыўкі ў профільную арганізацыю. Мяне не радуе той факт, што людзі мала разбіраюцца ў гэтым пытанні. Нам сапраўды патрэбна нейкае інфармацыйнае суправаджэнне, каб жыхары Беларусі выкідалі смецце паасобку.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

ПА-ЕЎРАПЕЙСКУ

# КАНТЭЙНЕРЫ, СМЕЦЦЯВОЗЫ І МАШЫНА ДЛЯ РЭЗКІ ПАПЕРЫ

## Як міжнароднае супрацоўніцтва завода спрыяе экалагічнай сітуацыі ў горадзе

**Яшчэ нейкі дзясятак гадоў таму ўсе камунальна-бытавыя адходы Брэста вывозілі на палігон у Маларыцкі раён — гэта за 40 кіламетраў ад абласнога цэнтра. Але ў 2010 годзе быў узведзены смеццеперапрацоўчы завод, і сітуацыя, найперш у экалагічным плане, стала кардынальна мяняцца.**

Цяпер смецце прывозяць на прадпрыемства, арганічныя адходы тут перапрацоўваюць на біягаз, астатнія сартуюць і накіроўваюць на адпаведныя заводы па перапрацоўцы. Апошнім часам завод актыўна ўдзельнічае ў праграмах міжнароднага супрацоўніцтва.



### Для прыватнага сектара

Так, па праекце «Пастаўка абсталявання для зялёнай энергетыкі і комплекснага кіравання адходамі для падтрымання рэгіянальнага развіцця ў Беларусі» брэсцкі завод атрымаў 1,2 мільёна еўра тэхнічнай дапамогі. Менавіта за гэтыя сродкі закупілі 15 тысяч смеццевых кантэйнераў для абслугоўвання гараджан, якія жывуць у прыватным сектары.

**Начальнік аддзела экалогіі і знешніх сувязяў завода Наталля ТРЫФАНАВА** расказала, што раней жыхары дамоў індывідуальнай забудовы, як правіла, пакідалі на вуліцы каля дома пакеты ў дзень забору смецця. Бадзяжныя жывёлы вельмі часта расцягвалі змесціва пакетаў па вуліцы. Не кажучы ўжо пра знешні выгляд, які не ўсяляў аптымізму, горад нёс дадатковыя фінансавыя затраты, бо патрабавалася часцей прыбіраць тэрыторыю. Таму адміністрацыя Брэста разам з кіраўніцтвам завода прынялі рашэнне выдаваць кантэйнеры для бытавых адходаў домаўладальнікам бясплатна.

Бак умяшчальнасцю 120 літраў можна было атрымаць, звярнуўшыся на завод з уласнай заявай. Глядзелі толькі на адсутнасць даўгоў у грамадзян па аплаце адпаведнай паслугі. Людзі з задавальненнем бралі такія ёмістасці. І цяпер вуліцы і завулкі прыватнага сектара выглядаюць куды больш цывілізавана.

### Машыны і пляцоўкі

На сродкі гранта ЕС таксама закупілі чатыры новыя машыны — тры смеццявозы і адзін шматфункцыянальны смеццявоз. Новыя грузавікі MAN аснашчаныя бакамі, якія адкрываюцца ў задняй частцы аўтамабіля. Тэхнічная спецыфікацыя машыны дазваляе кантраляваць размеркаванне нагрузкі і ўстойлівасць на дарозе. Да таго ж пры загрузцы такой машыны смецце практычна зусім не раскідваецца.

У выніку міжнароднага супрацоўніцтва на вуліцах Брэста паявілася яшчэ адно ноу-хау, накіраванае на паляпшэнне як эстэтычнага выгляду, так і стану навакольнага асяроддзя. Гаворка ідзе пра падземныя пляцоўкі для збору бытавых адходаў. Яны змантараваныя каля дамоў 9—11 па вуліцы Марозава і 27—29 па вуліцы Вароўскага. Кожная «падземка» абслугоўвае да тысячы чалавек. І жыхары шматкватэрных дамоў ацанілі такі еўрапейскі падыход да збору смецця.




Пляцоўкі на ўказаных вуліцах аднолькавыя. Кожная з іх складаецца з трох заглыбленых ёмістасцяў аб'ёмам да трох кубічных метраў. Дзве з іх вызначаныя для змешаных адходаў, адна — для шкла. (Для макулатуры і пластыку непадалёку ўстаноўлены еўракантэйнеры.) Паколькі над зямлёй выступае толькі верхняя частка кантэйнераў, куды апускаецца пакет, яны не выглядаюць грувасткімі, а эфектыўная сістэма бяспекі не патрабуе агароджы. Такім чынам, смецце не можа быць расцягнутае жывёламі альбо птушкамі, практычна не адчуваецца непрыемны пах нават у летнюю спёку. Цана пытання склала 490 мільёнаў недэнамінаваных рублёў. З іх 400 мільёнаў было атрымана па гранце, астатнія сродкі выдзеліў завод, за іх была выраблена дакументацыя і праведзены мантаж абсталявання.

### Чыстая макулатура

Як вядома, адна з каштоўных крыніц другасных рэсурсаў — макулатура. Практычна ўсе канторы і офісы выкарыстоўваюць у працэсе работы горы папер, якія з часам страчваюць актуальнасць. Большасць арганізацый і ўстаноў здаюць адпрацаваную паперу ў макулатуру. Але ёсць шэраг арганізацый, якія выкарыстоўваюць у рабоце дакументы розных ступеняў сакрэтнасці. Скажам, бальніцы, паліклінікі альбо аддзелы ўнутраных спраў не могуць выкідваць паперы на сметнік. Раней тоны карыснай сыравіны гарэлі ў печах. Зразумела, што папера — не самая лепшая крыніца цеплавой энергіі, але іншага спосабу ўтылізацыі проста не існавала. Ён паявіўся нядаўна, зноў жа ў парадку тэхнічнай дапамогі ЕС.

Цяпер брэсцкае прадпрыемства атрымала спецыяльную машыну. Яна здрабняе дакументы да тонкіх палосак, якія беспаваротна страчваюць функцыю носьбіта інфармацыі, але захоўваюць функцыю макулатуры. «Прычым якасная макулатура, — падкрэсліла Наталля Трыфанава. — Калі папяровыя адходы з кантэйнераў пабывалі ў суседстве з адходамі арганічнага характару, яны не могуць лічыцца каштоўнай сыравінай. А ў выпадку здрабнення на машыне мы маем на выхадзе чыстую сыравіну, якой нескладана знайсці спажыўца».

Дзякуючы дзейнасці завода на новы ўзровень паднялася сістэма збору бытавога смецця і павысілася яго каштоўнасць як сыравіннага рэсурсу, а таксама палепшылася экалагічная абстаноўка ў абласным цэнтры. А пачынаючы з мая гэтага года прадпрыемства забірае адходы з населеных пунктаў васьмі сельсаветаў Брэсцкага раёна, якія раней вывозіліся на палігоны. Гэта значыць, што экалагічная абстаноўка на тэрыторыі раёна таксама будзе паляпшацца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

4 октября 2017 г. №10-С/2017

**ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. Гомеле**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Наличие ограничений | Целевое назначение | Начальная стоимость, руб. / коп. | Сумма задатка, руб. / коп. | Затраты на подготовку документации, руб. / коп. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | по проезду Ильича (участок №2) | 340100000007072389 | 0,1000 | Ограничений в использовании не имеет | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 23 004 р. 10 коп. | 400 р. 00 коп. | 1 725 р. 73 коп. |
| 2 | по проезду Ильича (участок №3) | 340100000007072388 | 0,1000 | | | 23 004 р. 10 коп. | 400 р. 00 коп. | 1 725 р. 73 коп. |
| 3 | по ул. Витебской, 1-й, 68 (участок № 1) | 340100000002005951 | 0,0955 | | | 32 904 р. 18 коп. | 400 р. 00 коп. | 2 276 р. 28 коп. |

1. Организатор аукционных торгов – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462. Инженерное развитие инфроструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6.
3. **Аукцион состоится 4 октября 2017 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115** при наличии не менее двух участников на каждый лот.
4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении, с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY23912. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).
Необходимые документы:
4.1. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;
4.2. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;
4.3. представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.
4.4. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору аукциона затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Если заявление на участие в аукционе подано только одним гражданином или юридическим лицом, земельный участок предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. №83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления с приложением необходимых документов для участия в аукционе принимаются Государсвенным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 30 августа по 2 октября 2017 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6**

Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.30 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. №115

**Контактный телефон: 41-97-86. Информация размещена на сайте: www.qomel.qov.by либо geodezcentr.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ

**Брагинский районный исполнительный комитет извещает о проведении аукционов на право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания торгового объекта**

**Примечание**

1. Заявление и прилагаемые к нему документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. п. Брагин, пл. Ленина, 3, землеустроительная служба Брагинского райисполкома с первого дня после публикации извещения в СМИ в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Информация о земельных участках по контактному телефону в г. п. Брагин (8-02344) 21762.

2. Для участия в аукционе необходимо предоставить: заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка; заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет (сумма задатка перечисляется в срок не позднее двух дней до проведения аукциона).

3. Кроме того, в комиссию предоставляются: юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и копия паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально удостоверенная доверенность.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка – 10% от предыдущей цены, называемой аукционистом.

